ЗЬВЯЗДА

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

№ 110 (3218) Субота, 18-га Мая 1929 г.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫЕ ў гадз ночы:

БЭРЛІН, 17. Гамбургскі сэнат абвясьціў горад на час з 17 па 21 мая на становішчы ўзмоцненай ахраны і забараніў усякія сходы КПГ і „зьвязаных з ею арганізацый". Забаронены таксама дзьве камуністычныя газэты.

Апошнія навіны Б. С. С. Р.

Пасылка батракоў на курорты і ў дамы адпачынку

ЦК саюзу сельгаспрацоўных пасылае ў гэтым годзе ў дамы адпачынку 1.000 батракоў і с.-г. рабочых. Акрамя гэтага на курорты і ў санаторыі будзе пасланa 150 батракоў і с.-г. рабочых.

Па спэцыяльнасьці

Нямецкі сац.-дэмакратычны друк стараецца з усіх сіл апраўдаць перад грамадзкай думкай мінавайцаў майскіх расстрэлаў, якія запляміці сябе рабочай крывёю.



Ня турбуйся, дарагі калега... мы гэтыя плямы дасканала ведаем—гэта наша спэцыяльнасьць!

Антысавецкія выступленьні нямецкіх „міралюбцаў"

Усё больш выразна выяўляецца шлях Нямеччыны да палярызацыі клясавых сіл, да росту і накапленьня гэтых сіл па крайніх клясавых канцавосьсях за кошт прамежных пластоў. Разам з тым паскараецца і тэмп фашызацыі краіны пры дапамозе сацыял-дэмакратаў. Усё больш частыя выпады супроць СССР гучаць у апошні час і з вуснаў тых пацыфісцкіх пластоў «левай» буржуазіі, якая да гэтага часу на ўвесь сьвет крычала аб сваёй адданасьці ідэі міру і лёяльнасьці ў адносінах да СССР.

Пацыфісты Герлах у сваім органе «Дзі Вельт ам Монтаг» пахабна заяўляе:

«Масква пачала палітычнае генэральнае наступленьне супроць Нямеччыны» (?!). І далей Герлах усклікае ў паніцы—«Правакуюць, хочуць правакаваць... хочуць узмацніць хваляваньні ў Нямеччыне. Нямецкаму ўраду хочуць кінуць камень пад ногі іменна таму, што на чале ўраду стаіць сацыял-дэмакрат». Зьвязваючы «Маскоўскія козні» з ростам рэвалюцыйнага руху ў Нямеччыне, Герлах піша:

«Спосабы задушэньня гэтага руху—забарона саюзу чырвоных франтавікоў, па яго думцы, мера мала прыгодная, **прыгодным-жа сродкам для дасягненьня сваёй «шляхэтнай» мэты пан фон-Герлах лічыць урэгуляваньне гандлёвых адносін з Польшчай, якія ён разглядае, як першы крок да заключэньня саюзу супроць СССР.** Ён зазначае пры гэтым, што Пілсудзкі вітаў-бы гэту ідэю, і марыць аб тым, каб «скончыць шляхам гандлёвага дагавору 4-хгадовую гандлёвую вайну». Для многіх нямецкіх рабочых, якія знаходзяцца яшчэ ў палоне дробна-буржуазных пацыфісцкіх ілюзый, будзе вельмі карысна даведацца, што і «левае» крыло нямецкай буржуазіі ў момант абвастрэньня клясавай барацьбы, адкрыта прапаведуе вайну супроць СССР. Справа, вразумела, ня ў Герлаху. Справа ў характары тых настрояў, якія ахапляюць ня толькі верхавіну нямецкай буржуазіі.

Пляны фашызацыі Нямеччыны, пляны задушэньня рабочага руху, пляны, якія прадугледжваюць удзел у вайне супроць СССР, прадастаўленьне тэрыторыі Нямеччыне ў якасьці плянфарму для наступленьня супроць краіны саветаў і г. д.—гэтыя пляны ўсё больш часта і адкрыта выяўляюцца на старонках нямецкага буржуазнага друку. Прычыны рэзкага абвастрэньня клясавых супярэчнасьцяй, росту беспрацоўя, наступленьня капіталу і кантр-атакі пралетарыяту хаваецца ва ўсім працэсе гістарычнага разьвіцьця Нямеччыны і Эўропы ў трэці перыяд. Ніякія выпады супроць СССР ня вгладзяць клясавых супярэчнасьцяй, не дадуць выхаду ў унутраных затрудненьняў, не зацямняць у масах сьвядомасьці аб няўхільнай расплаце панучых клясаў за пралітую ў Бэрліне кроў. («Правда»).

НОВАЕ ПОДЛАЕ ЗАБОЙСТВА

ЦК МОПР'у паведамляе, што польскі камуністы т. Пашын, які праяжджаў праз Латвію ў СССР, дзе ён быў намераны шукаць прытулку, быў арыштаваны латвійскай ахранкай. Латвійская ўлада перавязла т. Пашына ў Дзьвінск, дзе выдала яго агентам польскай паліцыі. Далейшы лёс т. Пашына невядомы. ЦК МОПР'у непакоіцца, што т. Пашын забіты. Гэты непакой мае вельмі сур'ёзныя падставы. Латвійскі і польскі пасланьнікі крывёю т. Пашына замацавалі польска-латвійскі паліцэйскі саюз, які існуе ўжо даўно. Адкрытая выдача Латвіяй польскага камуністага які толькі праяжджаў ня спыняючыся праз Латвію, а значыцца, ня мог зрабіць нічога злачыннага з пункту погляду латвійскіх законаў, нарабіла-бы заходта шмат шуму. Значна прасьцей забіць палоньніка, спадзяючыся, што аб гэтым ніхто не даведаецца.

Аднак, гэтае гнуснае злачынства ня можа прайсьці няпрыкметна. Працоўныя Латвіі і Польшчы павінны ўжыць усе меры, каб высьвятліць далейшы лёс т. Пашына. Прыёмы, пры дапамозе якіх латвійская і польская буржуазія распраўляюцца са сваімі ворагамі, павінны быць выкрыты і заклеймены.

Справа т. Пашына зьяўляецца вельмі характэрнай з пункту погляду польска-латвійскіх адносін. Яна паказвае, як далёка зайшло супрацоўніцтва паміж ахранкамі і ваеннічнай Польшчы і Латвіі. Вядома, што незалежна ад таго ці іншага становішча польска-латвійскіх адносін саюз генэральных штабоў і ахранак абедзьвюх краін існуе даўно.

Цяпер мы бачым, што блізкія адносіны паміж гэтымі органамі робяць значны ўплыў і на ўрад, бо выдача т. Пашына палякам не магла мец месца бяз ведама і згоды латвійскага ўраду. Такім чынам на ўрады абедзьвюх краін падае адказнасьць за гэтае подлае злачынства. «ПРАЎДА».

Масавыя арышты бастуючых рабочых у ПАЗШ

Прадпрыемцы дамагаюцца абвяшчэньня стану аблогі

НЬЮ-ЁРК, 16. У Элізабэтоне (штат Тэнэсі) арыштавана 100 бастуючых тэкстыльшчыкаў за ўдзел у пікетах. 4 бастуючых цяжка паранены пры нападзе паліцыі на дэманстрацыю. Прадпрыемцы патрабуюць абвяшчэньня стану аблогі. У Нью-Ёрку паліцыя зьбіла і разагнала камуністых, якія ўдзельнічалі ў пікеце каля кіраўніцтва тэкстыльных прадпрыемстваў у Гастоні (у штаце Паўночная Караліна). (ТАСС).

Працоўныя БССР кляймяць ганьбаю нямецкіх сацыял-паліцэйскіх

ПРЭЧ КРЫВАВЫХ КАТАЎ—ЦЭРГІБЭЛЯЎ, ГРЖЭЗІНСКІХ

Агульны сход супрацоўнікаў ЦСУ, заслухаўшы інфармацыю аб крывавых падзеях у Бэрліне ў дзень 1-га мая, ганьбіць нячувана зьверскую расправу буржуазіі і яе прысьпешнікаў сацыялэдраднікаў з II-га інтэрнацыяналу, над рабочымі Бэрліну.

— Мы, супрацоўнікі, заяўляем, што ні кулямёты, ні бранявікі, якія былі пушчаны ў ход паліцэй-прэзыдэнтам Цэргібэлем супроць мірнай дэманстрацыі пралетарыяту, ня зломяць стойкасьць і адважнасьць пралетарыяту Нямеччыны.

Агульны сход шле пралетарыяту Бэрліну свае братэрскае спачуваньне і з поўнай адказнасьцю абяцае ў патрэбны момант выступіць адзіным фронтам супроць буржуазіі і іх лёкаяў сацыял-дэмакратаў.

У знак сваёй салідарнасьці супрацоўнікі ЦСУ пастанавілі аказаць братэрскую матар'яльную дапамогу ахвярам бэрлінскіх падзей.

Прэч крывавых катаў—Цэргібэляў, Гржэзінскіх!

Няхай жыве гэраічны пралетарыят Бэрліну!

Няхай жыве кампартыя Нямеччыны, якая пад кіраўніцтвам Камінтэрну прывядзе пралетарыят Нямеччыны да поўнай перамогі над буржуазіяй!

Няхай жыве адзіны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік ва ўсім сьвеце!

УЗМОЦНІМ ДАПАМОГУ АХВЯРАМ БЕЛАГА ТЭРОРУ

Працоўныя Талачынскай Спажывецкай каапэрацыі выносяць рашучы пратэст супроць крывавай расправы Цэргібэляўскіх малайцоў над мірнымі дэманстрантамі Бэрліну.

Выказваючы сваю салідарнасьць, сход аднагалосна пастанавіў адлічыць аднадзённы заработак з усіх служачых каапэрацыі на дапамогу сем'ям загінуўшых нямецкіх рабочых.

Няхай жыве гэраічны нямецкі пралетарыят!

Узмоцнім дапамогу ахвярам белага тэрору.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ПРАЛЕТАРСКАЯ САЛІДАРНАСЬЦЬ ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ

Мы, члены МОПР'у ячэйкі Белсельсаюзу, кляймім ганьбаю бэрлінскіх катаў—сацыял-эдраднікаў Зэвэрынгаў, Цэргібэляў і ім падобных, якія зьверскі расстрэльвалі рабочыя дэманстрацыі Бэрліну ў часе першамайскіх сьвят.

Няхай запомніць уся буржуазія і сацыял-эдраднікі, што расстрэламі ім не задушыць рэвалюцыйнага руху рабочых.

Няхай жыве пралетарская салідарнасьць рабочых усяго сьвету!

Няхай жыве МОПР!

У знак салідарнасьці сход пастанаўляе адлічыць ½% месячнага заработку ў карысьць сем'яў пацярпеўшых бэрлінскіх рабочых.

Бурныя мітынгі пратэсту працоўных па ўсім СССР

МАСКВА, 15. З розных канцоў Саюзу ССР паступаюць паведамленьні аб мітынгах пратэсту ў зьвязку з расстрэламі бэрлінскіх рабочых у першамайскія дні. Усюды на прадпрыемствах ідуць зборы на карысьць ахвяр сацыял-фашызму. Рад калектываў адлічыў 1 проц. месячнага заработку. Сума сабраных сродкаў перавышае ўжо 10.000 рублёў. Ахвяраваньні зьбіраюцца таксама і ў сёлах Новасібірскае акругі, сяляне якіх далучыліся да пратэстаў рабочых.

* * *

БАКУ, 16. Лятучыя мітынгі 1 сходы па промыслах і заводах Баку, на якіх выносяцца рэзалюцыі пратэсту супроць крывавага расстрэлу мірнай першамайскай дэманстрацыі Бэрлінскага пралетарыяту, працягваюцца. Рабочыя 20-га промысла Балахана-Сабунчынскага раёну выказваюць упэўненасьць, што большасьць нямецкіх рабочых яшчэ цясьней згуртуецца вакол нямецкай кампартыі. Адбыліся мітынгі на станцыі Баладжары і ў галоўных майстэрнях Касьпійскага параходства. (ТАСС).

* * *

АРЦЁМАЎСК, 15. Рабочыя і служачыя ўсіх прадпрыемстваў і ўстаноў акругі пастанавілі адлічыць 1 проц. месячнае зарплаты ў фонд дапамогі сем'ям рабочых, загінуўшых на барыкадах 1-га мая ў Бэрліне. (ТАСС).

НОВАЯ АНТЫСАВЕЦКАЯ ІНТРЫГА

Сёньняшнія тэлеграмы з Токіё паведамляюць аб згодзе паміж дзьвюма групамі японскіх рыба-прамыслоўцаў, якія рэзка выступалі адна супроць другой у часе нядаўніх таргоў на рыбалоўныя вучасткі ў нашых Ціхаакіянскіх водах. Сэнс гэтай зьдзелкі зводзіцца да таго, што ранейшыя канкурэнты аб'яднаюцца з мэтай процістаўіць адзіны фронт савецкаму ўраду. Як вядома таргі, што адбыліся ва Уладзівастоке, скончыліся тым, што японскае рыба-прамысловае таварыства «Ніціро Гёгё» якое было манапольным арэндатарам рыбалоўных вучасткаў у нашых водах, сустрэла на гэты раз сур'ёзнага канкурэнта ў асобе групы рыбных прамыслоўцаў, на чале якіх стаяла група Ўта.

Калі ў Японіі стала вядома, што група Ўта заарэндавала каля 70 вучасткаў, якія знаходзіліся раней у руках «Ніціро Гёгё», біржа рэагавала на гэта рэзкім паніжэньнем акцый Ніціро. З прычыны таго, што эксплёатацыя нашых рыбалоўных вучасткаў дастаўляла Ніціро вялізныя прыбыткі, дык натуральна, што аб'яднаньне Ніціро рыбных прамыслоўцаў імкнуліся да таго, каб дабіцца ранейшага становішча. Яны ня спыняліся пры гэтым на самых недарэчных абвінавачаньнях савецкага ўраду, і асабліва абвінавачвалі ў парушэньні рыбалоўнай канвэнцыі. Яны нават спрабавалі схіліць японскі ўрад да таго, каб ён заявіў пратэст Савецкаму Саюзу. Аднак, японскі ўрад адмовіўся ўмяшацца ў канфлікт, зусім правільна зазначыўшы прадстаўніком Ніціро, што гэта азначала-бы ўмяшаньне ва ўнутраныя справы СССР.

Тым больш дзіўным зьяўляецца сёньняшняе паведамленьне «Дзі-Дзі» аб тым, быццам японскі ўрад рыхтуецца да «свабоднай лоўлі рыбы» (?!) у савецкіх водах, калі савецкі ўрад не згодзіцца зьнізіць арэндную плату за вучасткі, набытыя былымі канкурэнтамі Ніціро. У пераводзе на простую мову гэта азначае, што Японія намерана ажыцьцявіць захопнае права, г. зн. вярнуцца да выпрабаваных разбойніцкіх мэтадаў з часоў інтэрвэнцыі.

Нас менш за ўсё цікавяць закулісныя камбінацыі, якія прывялі да зьдзелкі паміж «Ніціро Гёгё» і групай «Ута». Мы, аднак, лічым неабходным напомніць, што час інтэрвэнцый мінуў, і вярнуць іх нікому ня ўдасца. Экспляатаваць нашы рыбныя прамыслы пад аховай «крэйсэроў», як аб гэтым мараць некаторыя японскія капіталісты, СССР нікому не дазволіць. Усе спробы шантажаваць савецкі ўрад пагрозамі загадзя асуджаны на няўдачу. Таму мы мяркуем, што паведамленьне «Дзі-Дзі» зьяўляецца неправераным чуткамі. («ПРАВДА»).

У ЛІТВЕ

ПРЫСУД НАД ТАЎРОГЕНСКІМІ ПАЎСТАНЦАМІ

ВІЛЬНЯ, 14. Па вестках з Коўні, працэс Таўрогенскіх паўстанцаў закончыўся. Чацьвера абвінавачаных засуджаны на бестэрміновую катаргу, трое на 15 год, а рэшта—ад 1 да 5 год турмы. 25 падсудных апраўданы. («К. Віл.»).

ВАЙНА Ў КІТАІ

Чуткі аб сутычцы паміж войскамі Фыня і Чан Кай-шы

ШАНХАЙ, 16. У горадзе распаўсюдзіліся чуткі аб сутычцы войск Фынь Юй-сяна і Чан Кай-шы ў раёне Ўшчангуана на Хубэйска-Хэнаньскай граніцы. Няма верагодных даных, якія-б пацьвердзілі гэтыя чуткі. Агенцтва Тачун паведамляе, што ня гледзячы на гэтыя чуткі лідэры нацыянальнага ўраду ў Нанкіне не занепакоены. Наадварот, Чан Кай-шы нібы запрасіў Фынь Юй-сяна прыбыць у Нанкін і разагнаць усялякія беспадстаўныя чуткі і ўнесьці супакой сярод насельніцтва. (ТАСС).

Паўстаньне ў гуандуньскім войску

ШАНХАЙ, 16. Як падае тэлеграфнае агенцтва Тохо, паўстала частка гандуньскіх войск, якія ўдзельнічаюць у ваенных дзеяньнях супроць гуансійскай групоўкі. У зьвязку з гэтым гуандуньскае камандаваньне прымушана было загарадзіць фронт супроць гуансійцаў, зьвярнуўшы выключную ўвагу на абарону Кантону. (ТАСС).

Адступленьне Фынь Юй-сяна ў Шэнсі і Ганьсу

ПЭЙПІН, 16. Камэнтуючы адступленьне Фынь Юй-сянаўскіх войск з Шанцдунскай правінцыі, ангельскі орган «Пекін энд Цяньцзін Таймс» заяўляе: «Адступленьне Фынь Юй-сянаўскіх войск у Шэнсі і Ганьсу азначае, або самазабойства гэтых войск, або згрупаваньне ўсіх сіл для раптоўнага магутнага ўдару». (ТАСС).

* * *

ЛЁНДАН, 16. Гонг-Конгскі карэспандэнт «Таймс» піша, што кантонцы зрабілі контр-атаку супроць гуансійскіх войск і выцясьнілі іх з Сампуя. (ТАСС).

У фашысцкай Польшчы

ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ЭМІГРАЦЫІ

ВАРАШВА, 12. Агульнае гаспадарчае становішча Польшчы пагоршваецца бязупынна. Крызіс прамысловасьці пашыраецца і паглыбляецца. Зачыняюцца адна за другой буйныя тэкстыльныя фабрыкі, скарачаюць сваю прадукцыю мэталічныя заводы, гарбарні і інш. Выкідваюцца на вуліцу ўсё новыя і новыя тысячы рабочых. Беспрацоўе расьце, а адпаведна з гэтым расьце і эміграцыя. Так па вестках «Голосу Правды» за 1927 г. з Польшчы эміграваля 148.000 чалавек, а ў 1928 г.—ужо 187.000 чалавек. З эўрапэйскіх краін найбольш польскіх эмігрантаў прыцягвае Нямеччына (85 тыс.), далей Францыя (32 тыс.). З заморскіх краін: Канада (27 тыс.) і Аргэнтына (22 тыс.). Эміграцыя ў Злучаныя Штаты дасягае толькі 8.500 чалавек.

Арышт украінскіх студэнтаў

ВАРШАВА, 16. У Тарнопальскім ваяводзтве арыштаваны 17 студэнтаў па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да ўкраінскай нацыяналісцкай вайсковай арганізацыі. (ТАСС).

УКРАІНСКАЕ ПЫТАНЬНЕ Ў ПОЛЬШЧЫ

ЛЬВОЎ, 2. Варшаўскі «Інстытут дасьледваньня нацыянальных пытаньняў» арганізаваў цыкль лекцый па украінскім пытаньні. Уступную лекцыю прачытаў праф. Раман Смаль-Стоцкі. Ён паказаў на необходнасьць саюзу Польшчы і Украіны. Лектар заявіў, што такі пункт гледжаньня белагвардзейцаў в Украінскай народнай рады.

Зьмяншэньне бюджэту

ВІЛЬНЯ, 14. Па вестках з Варшавы кіраўнік міністэрства фінансаў Матушэўскі апрацоўвае плян зьмяншэньня бюджэту на поўмільярда злотых. Зьмяншэньне мяркуецца правесьці за кошт скарачэньня новага будаўніцтва па гаспадарчых міністэрствах і ў другую чаргу за кошт апэрацыйных сум пасобных міністэрстваў. («К. Віл.»).

Скарачэньне бюджэту матывуецца пагоршаньнем дзяржаўных прыбыткаў і агульным крытычным становішчам фінансаў і народнае гаспадаркі. Але яшчэ большае значэньне мае другая прычына, гэта жаданьне мілітарысцкіх колаў вызваленыя сродкі выдаткаваць на ваенныя падрыхтаваньні па-за бюджэтам.

РАЗГОН РАБОЧАГА СХОДУ

ВАРШАВА, 13. Варшаўская паліцыя разагнала сход бастуючых краўцоў. Сход быў скліканы ў кіно «Вэльлёна». Варшаўскім акруговым камітэтам ППС—лявіцы. («Жэчп.»).

ПАВЕТРАНЫЯ І ЧЫГУНАЧНЫЯ КАТАСТРОФЫ

ВАРШАВА, 10. Каля Тшэбіны Ржаноўскага павету (Крак. ваяв.) упаў і разьбіўся вайсковы самалёт. Лётнікі выратаваліся. («Роб № 121).

У Кракаве ў часе паветраных манэўраў упаў і разьбіўся вайсковы самалёт. Лётнікі забіты на мейсцы. (Жэпч. № 119).

На Варшаўскім аэродроме таварыства «Лёт» згараў ангар для самалётаў і адзін самалёт. (Г. В.).

На станцыі Ржанув (Кракаўскае дырэкцыі) стыкнуліся два таварных цягнікі. Разьбіта 13 вагонаў. («Сл.»).

НАВІНЫ САВЕЦКАГА ДНЯ

У УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ АДКРЫВАЕЦЦА 20 МАЯ

Адкрыцьцё V зьезду саветаў Саюзу ССР адбудзецца 20-га мая, а 18-й гадзіне (6 гадзін увечары) у Вялікім Тэатры.

ПАРАДАК ДНЯ ЗЬЕЗДУ:

1. Даклад ураду Саюзу ССР—дакладчык т. А. І. Рыкаў.

2. Пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі СССР.

а) агульны даклад—дакладчык тав. Г. М. Кржыжаноўскі.

б) плян разьвіцьця прамысловасьці—дакладчык т. В. В. Куйбышэў.

3. Аб уздыме сельскае гаспадаркі і каапэрацыйным будаўніцтве ў вёсцы—дакладчык т. М. І. Калінін.

4. Справаздачны даклад Народнага Камісарыяту па вайсковых і марскіх справах—дакладчык т. К. Е. Варашылаў.

5. а) Паведамленьне ўраду РСФСР аб канстытуцыі РСФСР, зацьверджанай Усерасійскім зьездам саветаў—дакладчык т. Я. В. Палуян, б) Паведамленьне ўраду ЎССР аб канстытуцыі ЎССР, зацьверджанай Усеукраінскім зьездам саветаў—дакладчык т. Н. А. Скрыпнік.

6. Аб зьмене 21 артык. канстытуцыі Саюзу ССР.

7. Утварэньне ЦВК Саюзу ССР—выбары членаў Саюзнага Савету і зацьверджаньне членаў Савету Нацыянальнасьцяй.

ПРАФ. ПРААБРАЖЭНСКІ АБ НАФЦЕ НА УРАЛЕ

СЬВЯРДЛОЎСК, 16. Праф. Праабражэнскі зрабіў даклад на папыраным пасяджэньні прэзыдыуму Пэрмскага акруговага выканкому аб месцанараджэньнях нафты па Ўрале. Праф. Праабражэнскі сказаў:

«Віншую працоўных акругі і ўсяго Ўралу з адкрыцьцём бязумоўна вялікага месцанараджэньня нафты. За зьмест маёй заявы я адказваю сваім вопытам і рэпутацыяй. Пераданая вам вестка аб тым, што нафта пачала біць фантанам—памылкова. Тым ня менш, калі 5 дзён назад нельга было прадрачы вынікаў, дык сёньня можна катэгарычна сьцьвярджаць, што нафта будзе. Першыя нязначныя работы, спыненыя з прычыны разьліву Чусовай, станоўча гавораць аб вялікіх запасах нафты. Факты зьяўляюцца больш грандыёзнымі чым можна было лічыць. Усе даныя гавораць за тое, што можна разьлічваць на распаўсюджваньне нафтаносных пластоў на вялікай плошчы. Факты гавораць, што можна сьмела кінуць на гэту справу дзесяткі мільёнаў руб.

Сабраўшыяся наладзілі праф. Праабражэнскаму авацыю. Пастаноўлена стварыць камісію для садзейнічаньня ўральскім нафтавым промыслам, палепшыць дарогі, пабудаваць сховы і правесьці на промыслах тэлефон.

* * *

МАСКВА, 16. Прэзыдыум ВСНГ СССР запрапанаваў Грознафце выдзяліць 3 буравыя варштаты і необходны пэрсанал для свідраваньня у Раёне Чусовай (Урал). Як падае намесьнік кіраўніка Грознафтай т. Пэйтачова, работа па збору абсталяваньня для адпраўкі на Урал разгорнута. ВСНГ СССР тэлеграфна запрапанаваў гэалёгу Праабражэнскаму тэрмінова адправіць у Маскву для аналізу 50 кілёграм уральскай нафты. (ТАСС).

ЗАМЕЖНЫ ГАНДАЛЬ СССР

Паводле папярэдніх даных Наркамгандлю СССР, зварот замежнага гандлю СССР па эўрапэйскай граніцы склаў у красавіку бягучага году 117 млн. руб. супроць 111,8 млн. руб.—у красавіку 1928 г. Экспарт (вываз) у красавіку склаў 57,9 млн. руб. супроць 45,3 млн. руб. у красавіку мінулага году, а імпарт (увоз)—59,1 млн. руб. супроць 66,5 млн. руб. у красавіку мінулага году.

Агульны зварот замежнага гандлю СССР за 7 месяцаў (кастрычнік—красавік) 1928-29 г. раўняецца 768,8 млн. руб. супроць 756,8 млн. руб. за той-жа час у 27-28 годзе. Экспарт за 7 месяцаў склаў 398,6 млн. руб. павялічыўшыся на 15,2 проц. у параўнаньні з мінулым годам.

Увесь с.-г. экспарт склаў за 7 мес. 322 млн. руб. Экспарт прамысловых тавараў склаў за 7 месяцаў 176,6 млн. руб., даўшы павялічэньне на 45,2 проц. у параўнаньні з папярэднім годам. **Амаль усе артыкулы прамэкспарту далі значнае павялічэньне.** Так, экспрат лесаматар'ялаў павялічыўся ан 70,1 проц., экспарт нафтапрадуктаў павялічыўся з 50,8 млн. руб. да 64,2 млн. руб. і г. д.

Імпарт за 7 месяцаў склаў 370,2 млн. руб. супроць 418,8 млн. руб. у 27-28 годзе. Імпарт абсталяваньня некалькі паменшыўся параўнаўча з мінулым годам, склаўшы 110,5 млн. руб. Паменшыўся таксама імпарт сырцу, які склаў за 7 месяцаў бягучага году 135 млн. руб. **Рэзка павялічыўся імпарт с.-г. машын і прылад, склаўшы 26,2 млн. руб. супроць 11,7 млн. руб. у мінулым годзе.** Увесь вытворчы імпарт склаў 338,6 млн. руб., даўшы памяншэньне ў параўнаньні з мінулым годам на 9,1 проц.

Балянс замежнага гандлю СССР за 7 месяцаў па эўрапэйскай граніцы склаў 28,4 млн. руб. актыву супроць 80,8 млн. руб. пасыву за той-жа час у 27-28 годзе (г. зн., мы ў першым выпадку на 28,4 млн. руб. вывезьлі больш, чым увезьлі, а ў другім—на 80,8 млн. руб. вывезьлі менш, чым увезьлі).

ПРЫЕЗД У МАСКВУ тав. КРЭСЬЦІНСКАГА

МАСКВА, 16. У Маскву прыбыў паўнамоцны прадстаўнік СССР у Нямеччыне т. Н. Н. Крэсьцінскі. (ТАСС).

МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС САНІТАРНАЙ АВІЯЦЫІ

ПАРЫЖ, 15. У Парыжы адкрыўся міжнародны кангрэс санітарнай авіяцыі. На кангрэсе прадстаўлена 37 краін. (ТАСС).

Уплыў амэрыканскай кампартыі расьце

НЬЮ-ЁРК, 16. На муніцыпальных выбарах у прамысловым горадзе Нью-Арк (штат Нью-Джэрсі) кампартыя атрымала 1.900 галасоў. У мінулым годзе на прэзыдэнцкіх выбарах камуністыя сабралі ў гэтым-жа горадзе 350 галасоў, а ва ўсім штаце 1.200. У ліку прыхільнікаў кампартыі, што падавалі галасы за яе, шмат неграў. Усяго ў Нью-Арку ў выбарах удзельнічала 114.000 чалавек. (ТАСС).

Амэрыка зацікаўлена савецкім рынкам

НЬЮ-ЁРК, 16. Камэнтуючы маючую адбыцца паездку амэрыканскай гандлёва-прамысловай дэлегацыі ў СССР газэта «Уорлд» заяўляе, што, ня гледзячы на палітыку амэрыканскага міністэрства замежных спраў, Савецкі Саюз становіцца ўсё больш значным рынкам. Газэта далей падкрэсьлівае, што СССР ўладае найвялікшымі нераспрацаванымі натуральнымі рэсурсамі ў сьвеце і зьяўляецца ў патэнцыі адным з лепшых рынкаў у сьвеце для амэрыканскіх тавараў.

«Нью-Ёрк Гэральд энд Трыбюн», падкрэсьліваючы ўплыў дзелавых колаў, зьвязаных з расійска-амэрыканскай гандлёвай палатай, заяўляе, што дэлегацыя, магчыма, зможа даць шмат каштоўных разьясьненьняў як амэрыканцам, так і рускім. (ТАСС).

Савецкі рынак прадстаўляе вялізныя магчымасьці

ЛЁНДАН, 16. Член дэлегацыі ангельскіх прамыслоўцаў, які наведаў нядаўна СССР—Бэрлейн, выступаючы на пасяджэньні Манчэстэрскай асацыяцыі імпарцёраў і экспарцёраў заявіў, што на яго вялікае ўражаньне зрабілі дзелавітасьць і прастата кіраўнікоў савецкіх прамысловых і гандлёвых арганізацый. Бэрлейн падкрэсьліў, што савецкі рынак прадстаўляе вялізныя магчымасьці для ангельскай прамысловасьці. Аднак, сказаў Бэрлейн, савецкім рынкам цікавяцца і іншыя канкурэнты і, калі мы будзем сядзець і нічога не рабіць, дык знойдзем на савецкім рынку толькі тыя заказы, якія непатрэбны для іншых краін. (ТАСС).

Прысуд над рэдактарам „Юманітэ"

ПАРЫЖ, 16. Парыскі апэляцыйны суд зьмягчыў першы прыгавор і асудзіў рэдактара замежнага аддзелу «Юманітэ» Габрыэля Перы за надрукаваньне ў «Юманітэ» артыкулу з заклікам французскіх салдат да братаньня з рэвалюцыйнымі кітайскімі салдатамі, да 6 месяцаў турэмнага зьняволеньня і да штрафу ў 2.000 франкаў. (ТАСС).

У апошні час узброеныя банды басмачоў робяць напад на тэрыторыю Таджыкскай ССР.

Чэмбэрлен пушчае крывавых канаркаў.

КВЕТКІ СУЧАСНАГА МІЛІТАРЫЗМУ

6-я сэсія падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні скончылася, ці, як гавораць у Лізе Нацый, часова перарвана «на неакрэсьлены час». Вынік яе досыць выразна абмаляваны т. Літвінавым у яго заключнай прамове і зводзіцца нават не да нулю, **а да адмоўнай велічыні.** Інакш кажучы, ня толькі ня зроблена ніводнага кроку па шляху сапраўднага разбраеньня, але, наадварот, мы знаходзімся ад апошняга далей, чым да 6-й сэсіі падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні.

Мэтаю гэтага артыкулу зьяўляецца ня крытыка разбройваючай работы Лігі Нацый, а жаданьне паказаць савецкаму чытачу, **што адбываецца ў арміях капіталістычных дзяржаў у той час, як у Жэнэве льлецца вада мірных прамоў, а таксама, якія формы сучаснага мілітарызму.**

* * *

Часта прыходзіцца чуць (асабліва з вуснаў чужаземных дзеячоў, якія хвалялцца сваім міралюбствам), што арміі тэй ці іншай дзяржавы колькасна не павялічваюцца або нават некалькі скараціліся. Сапраўды, у большасьці армій мы не наглядаем колькаснага іх росту. Толькі Англія і Злучаныя Штаты за апошнія гады некалькі павялічылі колькасьць сваіх армій—першая на 30, другая—на 70 тысяч чалавек. Але ці зьяўляецца гэты факт сапраўдным паказальнікам міралюбства буржуазных урадаў? Зразумела, не. І мы пастараемся гэта давесьці.

Сапраўдным паказальнікам узрастаючага мілітарызму зьяўляецца папершае, вялічэзны рост усякага роду буржуазнаклясавых узброеных сіл, якія атрымліваюць падрыхтоўку ў розных ваенна-грамадзкіх арганізацыях фашысцкага і паўфашысцкага афарбаваньня і, падругое,—вельмі вялікае павялічэньне ліку ваенна-абвучанага мужчынскага насельніцтва. У вялікіх краінах ад 75 да 90 проц. ліку мужчын зьяўляецца ваенна-абвучанымі, тады як да вайны найбольш мілітарысцкая краіна—імпэратарская Нямеччына мела ня больш 55% ваенна-абвучанага насельніцтва мужчынскага полу. Калі пры гэтым улічыць тую акалічнасьць, што **ўсе армії ўсё больш і больш насычаюцца вайсковымі прафэсыяналамі (з 10-12 проц. да вайны да 40-45 проц. у сучасны момант),** то становіцца зразумелым, якія магчымасьці адкрываюцца для **шпаркага разгортваньня шматмільённых армій у ваенны час, лічбовая вялічыня якіх, напэўна, перавысіць маштабы 1914-18 г.г.**

Вось чаму савецкая дэлегацыя ў Жэнэве і дамагалася значнага скарачэньня ліку абвучаных рэзэрву і цьвёрдага абмежаваньня ліку вайсковых прафэсыяналаў. Зразумела, як і трэба было чакаць, падобная прапанова была правалена.

* * *

Аб вялікім росьце вайсковай тэхнікі пісалася так многа, што наўрад ці варта гаварыць аб гэтым падрабязна цяпер. Сучасныя баявыя машыны-кулямёты, аўтаматычныя стрэльбы, лёгкія і цяжкія гарматы маюць уласьцівасьці, якія з аднаго боку палягчаюць іх скарыстаньне, а з другога—павялічваюць іх разбуральную дзейнасьць. Асабліва прыкметны, просто такі гіганцкі, скачок мы наглядаем у разьвіцьці ваеннай авіяцыі. Так, колькасьць паветранага флёту Англіі, Францыі і Італіі за час з 1923 г. павялічылася ў 1½ разы. Калі-ж улічыць, што тэхнічныя даныя самалётаў бягучага году ў тры ці чатыры разы вышэй даных тых-жа самалётаў ў 1923 г., дык атрымліваецца павялічэньне ўдарнай сілы самалётаў у 4-6 раз.

Трэба таксама адзначыць тую вялікую дасьледчую работу, якую праводзяць буржуазныя арміі.

У ангельскай арміі ў працягу 1928-29 г.г. (якраз паміж 5-й і 6-й сэсіямі падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні) **пры 208 штатных танках зьявілася ня менш 250 «дасьледчых», лёгкіх і цяжкіх танкаў, г. зн. лік іх павялічыўся больш чым у два разы.** Гэтыя весткі лёрд Кашэндэн можа ўзяць з ангельскай-жа часопісі «Арми Нэви энд Эфрос Газетт».

Грунтуючыся іменна на гэтых фактах, савецкая дэлегацыя і ўносіла на 6-й сэсіі прапановы аб спыненьні пераўзбройваючай ліхаманкі, аб вынішчэньні найбольш наступацельных відаў зброі, аб сапраўдным, простым скарачэньні ліку розных вайсковых матар'ялаў і ў войсках і на складах, аб забароне бамбардыраваць з самалётаў мірнае насельніцтва і г. д., і г. д. Лёс гэтых прапаноў агульнавядомы: жэнэўскім «міратворцам» яны да густу ня прышліся.

* * *

Вельмі яскравым паказальнікам мілітарызму зьяўляюцца мерапрыемствы, накіраваныя да максымальнага скарыстаньня ўсіх эканамічных рэсурсаў тае ці іншае дзяржавы для мэт вайны. У гэтым напрамку ва ўсіх буйных дзяржавах праведзена сапраўды гіганцкая работа, асабліва, **у справе падрыхтоўкі мабілізацыі прамысловасьці. Калі ў часе сусьветнай вайны на мабілізацыю прамысловасьці патрабавалася

Партыйнае будаўніцтва

Напярэдадні генэральнай

ПАРТЫЯ СТАВІЦЬ ПЕРАД САБОЙ ЗАДАЧУ—ВЫЗВАЛІЦЦА АД УСІХ НЕКАМУНІСТЫХ, НЕБАЛЬШАВІКОУ

Адкрыта перад рабочай клясай партыя ўважліва праверыць свае рады

МАСА ПАВІННА ВЕДАЦЬ, ЯК БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА ЧЫСТКА

З інструкцыі ЦКК УсеКП(б) аб задачах і мэтадах правядзеньня чысткі партыі

МЭТАДЫ РАБОТЫ ПРАВЕРКОМАЎ І ІХ ПАДЫХОД ДА ПРАВЯРАЕМЫХ

16. Чыстка і праверка работы партыйных ячэек і якасьці паасобных камуністых зусім не павінны разглядацца ні правяраючымі, ні правяраемымі, як агульнае недавер'е партыі да ўсіх камуністых данае ячэйкі. Праверкомы ў сваёй рабоце павінны ўжыць усе меры да таго, каб стварыць найбольш таварыскую абстаноўку, у якой кожны адданы партыі камуністы адчуў-бы, што ён заклікан дапамагчы справе выяўленьня і выкараненьня ўсіх недахопаў сваёй арганізацыі. Зусім недапушчальнай зьяўляецца адносіны пры асабовай праверцы камуністых. Праверкомы павінны азнаёміць кожнага камуністага з тым матар'ялам, які адносіцца да яго абвінавачаньня і толькі ў выпадку крайняй патрэбнасьці не называць прозьвішча таго, хто падаў заяву. Кожны правяраемы мае права на пэўную колькасьць часу для тлумачэньняў і абвяржэньня прад'яўленых яму абвінавачаньняў.

17. Праверкомы павінны пры асабовай праверцы камуністых асабліва беражліва адносіцца да рабочых ад варштату, да батракоў і беднякоў-сялян, і ў прыватнасьці: а) да жанчын з гэтых груп і да жанчын—матак у паасобку; б) да таварышоў, якія ня могуць праявіць вялікай партыйна-грамадзкай актыўнасьці па стане свайго здароўя, асабліва да інвалідаў грамадзянскае вайны.

18. Трэба надзвычайна асьцярожна ўжываць такія азначэньні якасьці правяраемага камуністага, як «партбаляст», «адарваўся ад масы», «разлажыўся» і г. д.

Нельга лічыць партыйным балястам таварыша, які добрасумленна выконвае свае абавязкі ў галіне, даручанай яму партыяй, савецкай, гаспадарчай, прафсаюзнай, каапэрацыйнай і іншай работы, якая забірае ўвесь яго час. Партыя мае права патрабаваць, каб тыя камуністы, чым-бы яны не займаліся на даручэньні партыі, аддавалі свой час на арганізацыйную, прапагандысцкую і агітацыйную работу на мясцох; але колькасьць гэтай работы павінна быць суразьмерана з асноўнай работай, здароўем і ўзроўнем агульнай культурнасьці і палітычнай пісьменнасьці кожнага таварыша. Разам з тым неабходна ў кожным даным выпадку праяўленьня камуністым пасыўнасьці ў партыйнай рабоце выясьніць, ці не вінавата ў гэтым ячайка, або іншыя камуністыя. Таксама трэба дакладна і ўсебакова разьбірацца і ў абвінавачаньні таго ці іншага камуністага ў адрыве ад мас, даючы суровы адпор тым, хто будзе прабаваць абвінаваціць у гэтым таварыша, які змагаецца з хвасьцізмам і вузка-цэхавымі настроямі і патрабаваньнямі, якія супярэчаць інтарэсам усяе рабочае клясы.

19. Зусім недапушчальна дробязнае капаньне ў асабістым быце камуністага. Бытавыя рысы камуністага, якія маюць анты-грамадзкі, анты-партыйны характар, як сыстэматычнае п'янства, а таксама антысэмітызм, рэлігійнасьць і г. д. не сумяшчальны з годнасьцю камуністага. Але ў кожным даным выпадку ў адносінах рабочых, батракоў і беднаты ў вёсцы неабходна дакладна разабрацца ў тым, наколькі непапраўны носьбіты гэтых якасьцей, ці не зьяўляюцца яны вынікам яго невыстарчальнай сьвядомасьці, адсталасьці або бязьдзейнасьці ячэйкі ў справе перавыхаваньня сваіх членаў.

20. Праверка павінна, урэшце, дапамагаць узьнясьцю ўзроўню палітычных зедаў камуністага. Аднак, праверкомы не павінны пры асабістай праверцы абарачаць яе ў экзамэны палітычнае пісьменнасьці, асабліва недапушчальна задаваць правяраемаму заблытаныя, незразумелыя пытаньні.

21. У адносінах камуністых—выхадцаў з дваран, купцоў, чыноўнікаў і дробнае буржуазіі, а таксама камуністых—выхадцаў з іншых партый праверкомы павінны выясьніць, ці зжыты якімі камуністымі чужая пралетарыяту ідэалёгія і навыкі і ці давялі яны на справе сваю адданасьць партыі. Асабліва ўважліва павінны быць праверены перабочыя, якія ўступілі ў нашу партыю пасьля грамадзянскае вайны. Праверачныя камісіі павінны цікавіцца сваяцкімі і іншымі сувязямі камуністых з буржуазным элемэнтам, галоўным чынам, з пункту гледжаньня матар'яльнай залежнасьці і ідэалёгічнага ўплыву гэтых чужых рабочай клясе элемэнтаў, звачаючы ўвагу на тое, каб у гэтых камуністых, якія датыкаюцца з чужымі элемэнтамі, іх адносіны не перарасталі ў бытавую, ідэалёгічную сувязь з імі. Пры праверцы гаспадарчых і іншых працаўнікоў, якіх партыя ставіць на работу, дзе патрэбна непасрэдна датыкацца з чужым пралетарыяту асяродзішчам, неабходна улічваць спэцыфічныя ўмовы работы гэтых таварышоў, правяраючы ў той-жа час, ці не перастаюць іх дзеловыя адносіны з чужымі элемэнтамі ў бытавую ідэалёгічную сувязь. Такія азначэньні якасьці камуністага, як «чужы элемэнт», або «сувязь з чужым элемэнтам», павінны ўжывацца праверкомамі з надзвычайнай уважлівасьцю і асьцярожнасьцю. Абвінаваціць правяраемага можна толькі ў тым выпадку, калі даведзена, што ён не парваў з ідэалёгіяй і бытам чужых пралетарыяту кляс, або сыстэматычна падтрымлівае сувязь з прадстаўнікамі гэтых кляс, якая зьневажае яго, як камуністага, і падрывае давер'е рабочых і працоўных да партыі пралетарыяту.

22. Пры праверцы камуністых, якія раней належалі да апазыцыйных груп і адышлі ад іх, праверкомы не павінны абмяжоўвацца толькі апытаньнем гэтых камуністых, а праверяць таксама і тое, што зроблена ячэйкаю ў адносінах ідэёвага ўплыву на гэтых камуністых, згодна дырэктывы 15-га зьезду УсеКП(б) аб адносінах да радавых членаў трацкісцкае апазыцыі.

23. Работа праверкомаў, як і ўсякіх іншых партыйных органаў, павінна праходзіць пад кантролем усёй партыі і ў тым ліку правяраемай арганізацыі. Любая ячэйка можа на агульным сходзе крытыкаваць любую пасганову праверкому і абскарджаць яе, не скасоўваючы, аднак, гэтае пастановы. Члены праверкомаў павінны памятаць, што за парушэньне ўнутрыпартыйнае дэмакратыі, за грубасьць і нетактычнасьць пры праверцы яны самі будуць прыцягвацца да партыйнай адказнасьці, як зьневажаючыя чыстку і партыю.

РАЗЬДЗЕЛ. IV. АРГАНІЗАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНАЯ РАБОТА ПРЫ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ПРАВЕРКІ І ЧЫСТКІ

24. Да пачатку чысткі і праверкі, праверкомы падрабязна знаёмяцца як з агульным станам і работай падлягаючых праверцы ячэек, так і з асабістым складам гэтых ячэек па матар'ялах, якія ёсьць у партыйным камітэце, КК і бюро ячэек і правяраюць даныя папярэдніх матар'ялаў.

25. Праверка і чыстка праводзіцца на адкрытых сходах ячэек (у буйных ячэйках па цэхах, вьменах, паасобных частках устаноў і г. д.), на якіх наперад заслухоўваецца і абгаворваецца наведамленьне праверачнай камісіі аб мэтах і задачах праверкі і чысткі і даклад бюро ячэйкі аб стане правяраемай арганізацыі. Праверка паасобных камуністых на сходах ячэек праводзіцца шляхам агалашэньня яе праверкомам біяграфічных даных і вестак, якія характарызуюць кожнага правяраемага, заслухоўваньня характарыстыкі адводаў і заяў удзельнікаў сходу і абгаварэньня іх па сутнасьці. Выразьненьне пытаньняў аб паасобных камуністых і адпаведныя меркаваньні на гэтых сходах не праводзяцца. На сходы ячэек, прысьвечаныя праверцы і чысткі, шырока прыцягваюцца беспартыйныя рабочыя, сяляне і служачыя. З гэтай мэтай сходы павінны склікацца ў памяшканьнях адпаведных прадпрыемстваў, устаноў або клюбаў у гадзіны, якія забясьпечваюць магчымы большае прыцягненьне партыйцаў і беспартыйных. На прысьвечаныя чысткі парт сходы ячэек савецкіх устаноў неабходна прыцягваць партыйных і беспартыйных рабочых тых прадпрыемстваў, якія зьвязаны з работаю данае ўстановы.

Увага: У выпадку патрэбы, праверкомы могуць дазваляць скліканьне, апрача адкрытых, і закрытыя сходы ячэек.

27. Па сканчэньні праверкі на адкрытых партсходах і правядзеньня работы, зьвязанай з дадатковым высьвятленьнем і расьсьледваньнем неабходных даных аб паасобных камуністах, праверкомы выносяць на сваіх пасяджэньнях пастановы аб кожным правяраемым камуністым.

28. Праверка якасьці работы ячэек, якая праводзіцца ў працэсе пэрсанальнае праверкі і чысткі камуністых, павінна ахапіць важнейшыя задачы партработы, прыстасоўна да асаблівых задач і ўмоў гэтай работы ў розных катэгорыях ячэек. Агульнымі для ўсіх катэгорый пытаньнямі павінны быць: стан партдысцыпліны, стан унутрыпартыйнай дэмакратыі і разгортваньне самакрытыкі, масавая работа, адносіны да вытворчасьці ў горадзе і калектыўнага будаўніцтва ў вёсцы, барацьба з ідэалёгічнымі хістаньнямі і ўхіламі.

29. Пасьля сканчэньня ўсёй работы па праверцы і чысткі ячэйкі, праверком на адкрытым сходзе робіць матываныя паведамленьні аб прынятых ім пастановах у адносінах кожнага з правераных камуністых і даклад з ацэнкаю агульнага стану работы. Паведамленьне і даклад праверкому абгаворваюцца на партсходзе прычым ячэйка мае права ў адносінах паасобных пастаноў праверкомаў, з якімі яна ня згодна, прасіць аб перагляздзе або абскарджаць у вышэйшыя органы. У неабходных выпадках агульны сход ячэйкі ў сувязі з праверкай можа быць закрытым.

30. У пратакол асабовае праверкі заносяцца наступныя даныя аб кожным правяраемым таварышу: прозьвішча, імя і па бацьку; з якога году ва УсеКП(б); № партбілету або кандыдацкае карткі; узрост, сацыяльнае паходжаньне; агульная асьвета; выконваемая работа ў момант праверкі, час прабываньня ў Чырвонай арміі, ці служыў у белай арміі па мабілізацыі ці добраахвотна—кім; чым займаўся да 1917 г., ці належаў да іншых партый і на працягу якога тэрміну. У адносінах сялян неабходна паказаць моцнасьць гаспадаркі ў момант праверкі, платную або бясплатную выбарную пасаду, у спажывецкай і сельска-гаспадарчай каапэрацыі, у прыватнасьці, удзел у калгасе. У адносінах да рабочых з вытворчасьці паказаць вытворчы стаж і кваліфікацыю, гаспадарчую сувязь з вёскаю. Тое-ж і ў адносінах камуністых—савецкіх служачых. У пратакол запісваюцца таксама даныя аб удзеле правяраемага таварыша ў партыйнай і грамадзкай рабоце і ўстаноўленыя праверкаю факты парушэньня кам'этыкі, партнявытрыманасьці, сувязі з чужымі элемэнтамі і інш. Усе гэтыя даныя пасьля іх дакладнай праверкі і даказанасьці, запісваюцца ў мэтываванай частцы пратаколу «слухалі». Пастановы камісіі аб выключэньні з партыі або партспагнаньні—у частцы «пастанавілі» вінны быць дакладна матываваны, угрунтаваны, з паказаньнем на ўстаноўленыя праверкаю факты. Да справы асабоае праверкі кожнага камуністага павінны быць прыложаны ўсе дакументы, якія пацьвярджаюць занесеныя у пратакол абвінавачаньні і адмоўныя характарыстыкі правяраемага. У выпадку адсутнасьці такіх дакумантаў, павінна быць паказана, з чыіх слоў запісана абвінавачаньне і кім і як яно праверана. Ні ў якім выпадку нельга дапускаць агульнай фармулёўкі пастановы, накшталт: «выключаецца з прычыны раду фактаў», або «як нягодны член партыі», «выключыць, як баляст». Павінна быць коратка, але дакладна паказана аб якіх фактах ідзе гутарка, у чым нягодны, або чаму «баляст» і г. д.

31. Праверкомы маюць права патрабаваць ад любой партыйнай арганізацыі і любога камуністага вестак, якія адносяцца як да работы іх у цэлым, так і ў ацэнцы якасьцей паасобнага камуністага. Праверкомам могуць быць апрошаны і беспартыйныя рабочыя, служачыя, сяляне.

32. У выпадку, калі член або кандыдат партыі па ўгрунтоўных прычынах ня можа зьявіцца да вызначанага тэрміну для праверкі—ён павінен быць праверены адпаведнай КК пасьля яго звароту ў сваёй-жа ячэйцы. Як правіла, праверка не павінна адбывацца ў адсутнасьці таварыша. Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў партыі па выкліку на праверачную камісію абавязкова. Кожны камуністы праходзіць праверку ў тэй ячэйцы, дзе ён знаходзіцца на сталым вучоце (дзе знаходзіцца яго вучотная картка). Такім чынам, камуністы, які знаходзіцца на вучоце ў ячэйцы тэй установы, у якой ён працуе, але прымацаваны для паасобных работ да прадпрыемства праходзіць чыстку ў ячэйцы ўстановы, але з вучотам і праверкаю водзыву аб ім ячэйкі прадпрыемства. У тых выпадках, калі камуністы знаходзіцца на вучоце ў ячэйцы не па месцы сваёй службы (або вучобы), ён праходзіць чыстку ў гэтай апошняй, прычым пры праверцы неабходна агрымаць водзыў аб правяраемым з месца яго работы. Таксама і ў тых выпадках, калі таварыш прыбыў у даную ячэйку з другой арганізацыі непасрэдна перад праверкаю, ён правяраецца ў тэй ячэйцы, дзе знаходзіцца ў момант праверкі, але пры ўмове атрыманьня характарыстыкі і іншых аб ім матар'ялаў з тэй арганізацыі, адкуль ён прыбыў. Арганізацыі павінны зараз-жа прысылаць усе матар'ялы і вестки.

Увага. Пры вучоце камуністых, якія прыбываюць для сэзонных работ на больш доўгі час, партыйны камітэт, адначасова з рэгістрацыяй сэзоньнікаў, паведамляе аб гэтым партыйную арганізацыю па месцы сталага пражываньня з просьбаю прыслаць на яго матар'ял з яго сталай ячэйкі, як правіла, правяраючы яго па месцы данае работы. Выдзяляюцца з агульнага парадку праверкі ўсе таварышы, у адносінах якіх праверком ня можа на месцы ўстанавіць важныя факты яго характарыстыкі. (Партстаж, сур'ёзныя абвінавачаньні і г. д.). У такіх выпадках справы аб гэтых таварышох перадаюцца адпаведным мясцовым КК.

33. Усе пастановы і вырашэньні праверкомаў набываюць моц з моманту зацьвярджэньня пратаколаў адпаведных КК і ўзгадненьня з адпаведнымі партыйнымі камітэтамі.

34. Практычныя арганізацыйныя прапановы праверкомаў як у адносінах ячэйкі ў цэлым, так і ў адносінах паасобнага камуністага праводзяцца ў жыцьцё ў парадку ажыцьцяўленьня партыйнымі камітэтамі кіраўніцтва партыйнай і савецкай работай.

35 Праверачныя камісіі могуць выносіць пастановы аб зьняцьці з работы таварышоў, калі яны лічаць шкодным знаходжаньне іх на займаемай рабоце, але правядзеньне ў жыцьцё гэтае пастановы належыць адпаведнаму камітэту партыі. Агалашэньне гэтае пастановы праводзіцца пасьля зацьвярджаньня пастановы праверкому КК і камітэтам партыі.

36. Пастанова праверкому перад паведамленьнем на апошнім сходзе ячэйкі павінна быць даведзена да ведама адпаведнага мясцовага парткамітэту.

37. Усе членскія білеты і кандыдацкія карткі правяраюцца з пункту гледжаньня правільнасьці запісаных у іх вестак. Членскія білеты і кандыдацкія карткі адбіраюцца толькі ў тых камуністых, аб якіх была пастанова праверкомаў аб іх выключэньні з партыі, узгодненая з адпаведным партыйным камітэтам і кантрольнай камісіяй. Пры ўскладаньні партспагнаньня робіцца адпаведная адзнака на вучотнай картцы камуністага пасьля таго, як пастанова праверкому аб партспагнаньні зацьверджана адпаведнай КК.

38. Камуністыя, выключаныя з партыі праверкомамі, не пазбаўляюцца права наведваньня закрытых партсходаў да моманту зацьверджаньня пастановы аб выключэньні адпаведнай КК.

39. Праверцы і чысткі не падлягаюць таварышы, прынятыя ў кандыдаты партыі, але яшчэ канчаткова не зацьверджаныя адпаведнай партыйнай інстанцыяй, згодна статуту партыі.

РАЗЬДЗЕЛ V. ВУЧОТ ВЫНІКАЎ ЧЫСТКІ І ПРАВЕРКІ І ПАРАДАК АБСКАРДЖАНЬНЯ

40. У працэсе правядзеньня чысткі і праверкі акруговыя КК пасылаюць адпаведным ЦКК нацкампартый, краёвым і абласным КК пэрыядычна, не радзей аднаго разу на тыдзень, зводкі аб ходзе чысткі і праверкі з лічбовымі данымі па форме, прапанованай статаддзелам ЦК УсеКП(б); копіі такіх пэрыядычных зводак адначасова накіроўваюцца ў арганізацыйна-інструктарскі аддзел ЦКК УсеКП(б). Распрацоўка матар'ялаў праверкі і чысткі праводзіцца апаратам парткому пад кіраўніцтвам КК.

41. Па сканчэньні праверкі такім-жа парадкам прадстаўляюцца справаздачныя даклады ў тэрміны, вызначаныя ЦКК УсеКП(б) для кожнай нацкампартыі, краёвай або абласной арганізацыі. Распрацоўка матар'ялаў чысткі і праверкі складаньне справаздачных дакладаў у акругах (губэрнях) робіцца адпаведнымі кантрольнымі камісіямі.

42. Члены і кандыдаты УсеКП(б), пазбаўленыя пастановамі праверкамісій, могуць абскардзіць іх у мясцовую КК у месячны тэрмін. Нездаволеныя пастановаю мясцовай КК могуць абскардзіць гэтыя пастановы ў вышэйстаячую КК праз мясцовую КК, а на пастановы апошняй у ЦКК УсеКП(б). Мясцовыя КК абавязаны гэтыя абскарджаньні з усёй справай па чысткі і ўсімі матар'ялямі зараз-жа пераслаць у вышэйшую КК, куды накіроўваецца данае абскарджаньне. Тэрмін для абскарджаньня пастаноў мясцовых КК у абласныя КК—месячны, ЦКК—2-х месячны з дня атрыманьня на рукі пастановы КК. У вучотнай картцы застаецца толькі канчатковае вырашэньне КК, вынесенае ў часе праверкі. Усе іншыя пастановы, вынесеныя ў часе апошняй праверкі, не запісваюцца.

43. Праверкомы абавязаны ня толькі расглумачыць выключанаму з партыі або таму камуністаму, на каго ўскладзена партспагнаньне, іх права на абскарджаньне ў тэрміны, але і аказваць ім дапамогу парадаю і паказаньнем адносна таго, як напісаць і паслаць апэляцыйную заяву, як і ў каго даведацца пра вынік абскарджаньня і г. д. Такая дапамога асабліва патрэбна ў адносінах камуністых рабочых, батракоў і беднякоў.

44. Кантрольныя камісіі ў часе азнаямленьня з пратаколамі праверкомаў могуць і павінны ставіць на перагляд справы выключаных і атрымаўшых партспагнаньне камуністых і пры адсутнасьці абскарджаньня апошнімі пастаноў праверкомаў, калі гэтыя пастановы невыстарчальна ўгрунтаваны, або калі праверка была праведзена з парушэньнем асноўных указаньняў гэтае інструкцыі. У такім выпадку перагляд справы праводзіцца абавязкова ў прысутнасьці старшыні або каго з членаў праверкому, па магчымасьці, у прысутнасьці правяраемага. Як правіла, апэляцыі наогул разглядаюцца КК у прысутнасьці старшыні або члена камісіі, якая выносіла адпаведную пастанову. Разгляд апэляцый на пастановы мясцовай КК, абласных КК і ЦКК адбываецца, па магчымасьці, у прысутнасьці прыцягваемых, або шляхам выезду на месцы.

45. У выпадку нязгоды праверкому з адменамі яго пастановы, праверком мае права абскарджаць гэту адмену сваёй пастановы ў вышэйстаячую КК.

Праверыць нашу ідэёва арганізацыйную падрыхтоўку да чысткі

Праз два-тры тыдні пачынаецца генэральная чыстка радоў КП(б)Б. Часу засталося не багата, таму трэба энэргічна праверыць, як партыя гатова сама і падрыхтавала масы да таго, каб пасьпяхова правесьці чыстку.

Гэтымі днямі «Правда» ў перадавіцы «Увага да чысткі партыі» пісала: «далёка ня ўсе арганізацыі падрыхтаваліся адноўкава да гэтай важнейшай партыйнай задачы. Трэба на ходу выпраўляць недахваты».

Нам трэба ўлічыць гэтае папярэджаньне, бо такое становішча бязумоўна наглядаецца і ў нас.

Так, «Зьвязда» ня раз паказвала на выпадкі неразуменьня задач і скажэньне арганізацыйных мэтадаў падрыхтоўкі да чысткі. Сярод гэтых выпадкаў амаль самым яскравым быў у Бягомпі (Менская акр.), дзе ўводзіліся так званая бытавая камісія і «сакрэтныя» гуртаркі з беспартыйнымі, для выяўленьня—каго чысьціць.

Зразумела, што ў такой вялізарнай рабоце, як чыстка паўтарамільённай партыі, без асобных памылак не абыйсьціся. Аднак, дабіцца **таго, каб гэтыя памылкі былі зьведзены да мінімума,** мы пры належнай **актыўнасьці і ініцыятыве партыйных мас—зрабіць можам і павінны.** Адсюль вынікае адказная задача: правядзеньне вялікай прапагандысцкай работы па асьвятленьні прынцыповых бакоў чысткі як сярод партыйных, так і беспартыйных мас. Да сёньняшняга дня такая работа праведзена ў кожнай арганізацыі—адбыліся адкрытыя сходы ячэек, сходы партактыву і раённых арганізацый у вёсцы. Але ці зможам мы сказаць, што ўсё ўжо зроблена, што прынцыповыя задачы чысткі партыі ўсьвядомлены масамі?

Мы павінны паставіць перад сабой такое пытаньне з тым, каб больш яскрава і поўна ўбачыць недахваты і промахі падрыхтоўчай работы да чысткі. Зразумела, лепшай праверкай будзе самая практыка чысткі. Але гэта не азначае, што трэба спакойна чакаць наступленьня чысткі, без выпраўленьня недахватаў на ходу работы.

Што тут у нас ня ўсё добра—паказвае наш друк, у якім сыстэматычнасьць і асабліва якасьць асьвятленьня пытаньняў чысткі яўна невыстарчальны. XVI канфэрэнцыя ў сваёй пастанове аб генэральнай чыстцы партыі ўскладзена асабліва адказныя задачы на наш друк. Ён зьяўляецца тым моцным падважнікам, пры дапамозе якога партыя мабілізуе масы вакол пытаньня чысткі. Праз друк, як праз люстра, мы павінны ясна ўбачыць тыя элемэнты, што павінны быць выкінуты з партыі, выкрыць недахваты работы і сувязі ячэек з працоўнымі масамі, арганізаваць масавыя прапановы па паляпшэньні работы нашых ячэек і г. д. Таксама, праз друк мы павінны вывіць, як падрыхтаваліся да чысткі ячэйкі і арганізацыі.

Аднак, калі, напрыклад, праглядаць нашы **акруговыя** газэты, дык там **ня знойдзеш стагага асьвятленьня пакаданых пытаньняў.** Большасьць зьмешчаных заметак ня ідзе далей асобных фактаў разлажэньня, шкурніцтва, або кар'ерызму асобных партыйцаў.

Слаба высьвятляецца канкрэтная работа парт'ячэек па такіх рашаючых пытаньнях, як барацьба за ўздым вытворчасьці, уздым ураджайнасьці, удзел у калгасным будаўніцтве і г. д. Такое пытаньне, як **мэтады ўцягненьня ў партыю новых рабочых,** таксама не знаходзіць належнага асьвятленьня. **Амаль зусім мы ня бачым** у газэтах канкрэтных узораў добрай (або дрэннай) **падрыхтоўкі** да чысткі партыі. А гэта вельмі важна, бо праз два-тры тыдні пачынаецца чыстка.

Мы, напрыклад, ня ведаем, як удзельнічаюць у падрыхтоўцы да чысткі **насьценгазэты.** А між тым яны, арганізуючы прапановы і думкі рабочых, батрацтва і бядняцтва, павінны адыграць вялікую ролю ў дасягненьні задач чысткі.

Былі-б зусім **шкоднымі** такія настроі, што «чысьціць будуць нас усіх», а таму актыўнічаць ня варта,—пяхай, моў, працуюць праверкомы. Такія настроі праяўляюцца ў часткі таварышоў і ім трэба абвясьціць рашучую **барацьбу.** Наша партыя—адзіная і кіруючая партыя ў краіне; яна сама арганізуе чыстку сваіх радоў, прыцягваючы працоўныя масы, **ні на хвіліну ня зьнімаючы з сябе адказнасьці за становішча краіны.**

Таму праяўленьне «дэмабілізацыйных настрояў» у адзінках трэба асудзіць сурова і рашуча.

Такім чынам, тэрмін, які застаецца да чысткі, патрабуе яшчэ раз уважліва прыглядзецца і **стала праверыць нашу ідэёва - арганізацыйную падрыхтоўку да яе.**

Мінімум усякіх памылак і промахаў у правядзеньні чысткі—гэтага трэба абавязкова дабіцца.

Няхай ячэйкі і партарганізацыі на старонках друку пакажуць, як яны на справе падрыхтаваліся да адказнейшай агульна-партыйнай задачы—чысткі партыі.

Час не чакае.

Л. Н.

Спыніць практыку перакідваньня скампрамэтаваных

ЦКК КП(б)Б у бліжэйшы час прыступае да праверкі таго, як скарыстоўваюцца камуністыя, зьнятыя з работы за розныя ўпушчэньні і ўчынкі.—Перакідваньню павінен быць пакладзен канец.—Выявіць, выкрыць тых, хто ігнаруе дырэктывы партыі—абавязак кожнага рабочага і працоўнага селяніна. Рабселькоры, на дапамогу ЦКК КП(б)Б

Дырэктывы партыі аб тым, што зьнятых за кепскую работу скампрамэтаваўшых сябе няпрыстойнымі ўчынкамі—ні ў якім разе нельга перасоўваць на тую-ж работу і тым больш на больш адказную работу,—такіх дырэктыў больш чым досыць. Дырэктывы жорсткія, катэгарычныя.

Яшчэ ў маі 1928 г. ЦКК УсеКП(б) зьвярнула ўвагу партарганізацый на недапушчальнасьць так зван. «хвастоў», калі часта сьледам за адказным кіраўніком, які перакідаецца, цягнецца галерэя яго «спадарожнікаў», якія прагнуць новага месца пад апекаю свайго «добрачынцы». Дырэктыва ёсьць, «хвасты» паслаблены, але не ліквідаваны да канца. Сям-там і ў нас падобная асуджаная практыка ўсё-ж мае сваё прыстасаваньне.

Красавіковы пленум ЦК і ЦКК таксама досыць рэзка асудзіў гэту практыку, калі канстатаваў, што пры **«падборы працаўнікоў, як правіла, адсутнічае сур'ёзная праверка мінулай работы;** пярэдка зьнятыя за кепскую работу пераводзяцца на новую і нават большую работу замест ачысткі ад гэтых элемэнтаў і вылучэньня новых кадраў гаспадарнікаў. **Пры назначэньні на адказную работу праяўляецца нездаровая сямейнасьць, «прыяцельскія сувязі» і г. д.».**

Нарэшце, у пастанове XVI партканфэрэнцыі па дакладу т. Якаўлева аб барацьбе з бюракратызмам мы атрымалі ясную дырэктыву, якая не пакідае ніякіх сумненьняў адносна недапушчальнасьці і палітычнай шкоднасьці «перакідваньня» неапраўдаўшых сябе работнікаў, людзей тыпу, што «штэмпэлюе чужыя думкі і прапановы».

АБУРАЮЧЫЯ ФАКТЫ З НАШАЙ РЭЧАІСНАСЬЦІ

Па дырэктыве ЦКК УсеКП(б) забаронена **«практыкаваць перакідваньні з аднэй адказнай пасады на другую членаў партыі, не апраўдаўшых сваімі паводзінамі яе давер'е, бо такое перакідваньне большай часткай толькі дапамагае іх далейшаму разлажэньню».**

Няўмелы падбор людзей, спакой па частцы выяўленьня таго, у якой меры даны таварыш апраўдаў сябе на ранейшай рабоце, няўлік часта грамадзкае думкі пры перакідваньні і перасоўваньні работнікаў,—на жаль, у радзе фактаў становяцца значнай перашкодай у сапраўднай барацьбе з бюракратызмам, выклікаючы законнае абурэньне мас, выклікаючы ў іх думкі аб слабым уплыве самакрытыкі і аб тым, што, зьнімаючы таго ці іншага работніка, мы толькі гуляем у біруль кі ці робім від, што змагаемся з бюракратызмам:

Усім, напрыклад, вядомы мазырскія факты з «перакідваньнем», калі патрабавалася ўмяшаньне ЦКК, каб паставіць на сваё месца тых, хто пасьля асуджэньня іх работы быў усё-ж такі высунуты на больш адказную работу.

У Полацку загадчыкам канторай Скурсыньдыкату быў назначаны Станкевіч, былы загадчык магілеўскай друкарні, які магілеўскай АКК быў зьняты з адказнай работы за рад праступкаў, бесгаспадарчасьць і за гісторыю з падпясеньнем працаўніком НКЗему блёкнотаў «з золотым тисненнем» (гэтая гісторыя шырока была вядома праз друк). І патрабавалася некалькі месяцаў «перакананьня» полацкіх органаў, каб прымусіць выканаць пастанову АКК.

Гісторыя з Шалімавым, судовым работнікам Полацку, які, ня гледзячы на сьледзтва аб яго злоўжываньнях, у 1927 годзе з ведама судовых органаў і па добрым водгуку віцебскага акрсуду перасунуўся на вылучэньне ў члены Курскага губсуду,—зьяўляецца простым пацьвярджэньнем таго, што такая сыстэма дапамагае далейшаму разлажэньню. Вось чаму прэзыдыум ЦКК КП(б)В паставіў гэта ў віну полацкім парторганам, паказаўшы, што «замест выкрыцьця дзейнасьці работніка, які разлажыўся, шляхам перакідваньня ў другую арганізацыю яму прадаставлена была магчымасьць заставацца на адказнай судовай рабоце».

Ня менш яскравым прыкладам гэтага-ж парадку зьяўляецца справа Казалёва, цяпер выключанага з партыі. У 1927 годзе ён у Рэчыцкай акрузе знаходзіўся пад сьледзтвам аб растрасе ў спажыўтаварыстве, дзе ён быў старшынёю. Шукаючы «ціхага прытулку», ён па пуцёўцы АК пераяжджае ў Магілеў. Там у яго ні аб чым ня пытаюцца і назначаюць на адказную каапэрацыйную работу ў раён. Гомельскі акрсуд яго асуджвае, але гэта не перашкаджае яму зноў заставацца на адказнай рабоце, і толькі ў 1929 годзе яго выключае з партыі магілеўская АКК. Характэрна, што гэты таварыш настолькі пыстасаваўся да нашай расхлябанасьці і адсутнасьці **праверкі мінулай работы,** што пасьпеў яшчэ да выключэньня з партыі перабрацца на пуцёўцы і з партбілетам у Менск. І зноў такі толькі ўмяшаньне ЦКК выкрывае гэтага выключанага, але захоўваючага партбілет.

Гэта пытаньне аб грубых памылках у падборы работнікаў зараз хвалюе рабочых масы. Няма ніводнага рабочага сходу, дзе-б ня было запісак ці выступленьняў на гэтую тэму. Такія лісты атрымліваюць і нашы газэты. Вось, напрыклад, перад намі ліст аднаго рабкора, які абураецца тым, што ДН ст. Менск, зьняты з работы па патрабаваньні ЦСПСБ і парторганаў за няправільнае звальненьне рабочых у часе аб'яднаньня ваказалу, быў усё-ж пераведзены на такую-ж работу ў другое месца. Прычым, у даным выпадку пакараньне пераўтварылася некаторым чынам у «захвочваньне», бо тут не абыйшлося бяз дорага каштуючых пад'ёмных. У Полацку-ж, у канторы Саўтандальфлёту было такое становішча, калі аднаго работніка трымалі ў **рэзэрве** да падшуканьня работы некалькі месяцаў. «Дабрата» там даходзіла да таго, што просты перапісчык апачуваўся, як дэклярант, і атрымліваў 125 руб. Такіх фактаў мы можам набраць шмат.

СПЫНІЦЬ ПЕРАКІДВАНЬНЕ—УЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ З БЮРАКРАТЫЗМ

Цяпер мы прыступілі да самага рашучага арабочаньня нашага апарату шляхам чысткі ад бюракратаў, незацікаўленых у нашым будаўніцтве і шкодных нам асоб. Наш апарат, горшая яго частка, бясспрэчна, праяўляе супраціўленьне прыцёку сьвежых сіл, вылучэнцаў з рабочых, батракоў і беднякоў. І калі пры назўнасьці гэтага супраціўленьня мы не правядзем пасьлядоўнай барацьбы з перакідваньнем, дык гэта яшчэ ў большай меры будзе перашкаджаць напай барацьбе в бюракратызмам. Па трэбна сталая пільнасьць нашых ячэек, прафсаюзаў, трэба ўзмацніць адказнасьць адміністратараў за заахвочваньне перасоўваньня скампрамэтаваных, зьнятых за праступкі работнікаў. У адносінах да членаў партыі трэба строга выконваць пастановы органаў ЦКК аб пасылцы на нізовую работу, па работу па спэцыяльнасьці, вырашаючы, зразумела, гэта пытаньне таксама і ў залежнасьці ад ступені сапраўднай вінаватасьці.

Кантрольныя камісіі павінны лічыць сваёй штодзённай задачай пастаянную праверку таго, у якой меры гэтыя дырэктывы партыі выконваюцца, не пакідаючы бяз увагі ніводнага паказаньня членаў партыі, рабочых, друку аб парушэньнях яе, строга сьледуючы наступнай дырэктыве XVI партканфэрэнцыі:

«У адносінах тых камуністых, праверка работы якіх устанавіла іх няпрыгоднасьць да справы дзяржаўнага кіраваньня, трэба самым рашучым чынам спыніць перакідваньне, якое зараз практыкуецца, такіх работнікаў з установы ва ўстанову і з раёну ў раён, якое толькі канчаткова губіць іх і адначасова перашкаджае паляпшэньню работы апарату і дабіцца іх няўхільнага звароту на работу па спэцыяльнасьці».

У часе чысткі савецкага апарату і чысткі партыі справа органаў ЦКК праверыць выкананьне гэтай дырэктывы.

А. ВІНАГРАДАЎ.

Памёр стары рэвалюцыянэр-падпольшчык

М. М. Мандэльштам

Памёр стары член партыі, былы загадчык агітпропам МК тав. Мандэльштам. Мікалай Мікалаевіч Мандэльштам (Міхаіл Міронавіч) па прафесіі электраманцёр, нарадзіўся ў 1879 годзе.

Да рэвалюцыі т. Мандэльштам правёў вялікую падпольную работу. У 1900 годзе ён далучыўся да «іскраўскай» групы. У 1903-1904 годзе ён быў членам варонескага і паўночна-заходняга камітэтаў «іскраўскай» арганізацыі і членам тэхнічнага бюро ЦК партыі. У гэтым-жа годзе ён быў членам рыскага і кацярынаслаўскага камітэтаў партыі.

З сакавіка 1905 году па 1907 г. тав. Мандэльштам—член падпольнага Маскоўскага камітэту і адказны арганізатар чыгуначнага і Ляфортаўскага раёнаў. У той-жа час ён выконвае абавязкі прапагандыстага ў чыгуначных майстэрнях.

У 1910 годзе т. Мандэльштам у Парыжы, адсюль ён пасылаецца т. Ногіным на работу ў Расію. Праз дзень пасьля прыезду арыштоўваецца і высылаецца ў Ніжні-Ноўгарад, адкуль ўцякае заграніцу.

У 1911-13 г.г. тав. Мандэльштам жыве ў Парыж

Да ўсіх арганізацый МОПР'у і працоўных мас БССР

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

У дні першамайскага сьвята, калі рабочыя і працоўныя масы свабоднага Савецкага Саюзу радасна сьвяткавалі сваё пралетарскае сьвята, на вуліцах Варшавы, Бэрліну, Парыжу і інш. цэнтраў, дзе пануе буржуазія, пралівалася рабочая кроў. Буржуазія і фашызм з актыўнай дапамогай сацыял-дэмакратыі адабралі ў рабочых правы на вуліцу. Бэрлінская сацыял-дэмакратычная паліцыя сустрэла першамайскія дэманстрацыі рабочых Бэрліну кулямётамі, гарматамі і бранявікамі. Безбройныя рабочыя Бэрліну на барыкадах заявялі з узброенымі фашыстымі і паліцыяй за правы на вуліцу, у выніках—дзесяткі, сотні забітых і параненых рабочых, масавыя арышты, якія працягваюцца без канца. Зноў рабочая кроў. Новыя ахвяры, загінуўшыя ад владзейскіх рук нямецкага фашызму і адрадніцкай сацыял-дэмакратыі. Новыя магілы, у якіх пахаваны лепшыя, багаты раз асабліва служыць свайму гасрацьбіты за справу вызваленьня рабочых і сялян. Новыя ўдовы, новыя сіроты. Нямецкая сацыял-дэмакратыя на гэты раз асабліва яскрава паказала свой твар прыручанага сабакі, які з сабачай вернасьцю служыць свайму гасхадару. Рэвалюцыйнаму пралетарыяту Нямеччыны цяпер зусім відавочна, што ў сваёй клясавай барацьбе ён мае супроць сябе буржуазію, фашызм і сацыял-дэмакратыю, якія складаюць адзін контр-рэвалюцыйны кулак, адзін крывавы камяк.

Братэрскі вітаючы рабочых Бэрліну і ўсяго сьвету, якія пад сьцягам Камінтэрну ўпарта змагаюцца за правы і свабоду для ўсяго прыгнечанага грамадзтва, выкажам наш рашучы пратэст супроць сацыял-фашыстых, якія крывёю рабочых залілі вуліцы Бэрліну і іншых гарадоў.

Усе арганізацыі МОПР'у БССР, усе працоўныя масы гораду і вёскі нашай свабоднай Савецкай Беларусі! Далучыце свой голас пратэсту да голасу пралетарыяту СССР, і ўсяго сьвету і прыдзеце на дапамогу жонкам і дзецям бэрлінскіх рэвалюцыянэраў, загінуўшых ад рук сацыял-фашызму.

Няхай ведаюць пралетары Бэрліну і ўсяго сьвету, што мы—працоўныя Савецкай Беларусі—на іх баку і заўсёды гатовы ім дапамагчы ў іх цяжкой барацьбе з-пад ціску і няволі.

Няхай ведае буржуазія ўсяго сьвету, што з кожнай кроплі пралітай рабочай крыві народзяцца новыя і новыя мільёны пралетарскіх барацьбітоў—магільшчыкаў буржуазнага ладу. Ніякімі зьдзекамі і гвалтаваньнямі, ніякім здрадніцтвам сацыял-дэмакратаў буржуазіі не знайсьці сабе ратунку.

Таварышы! На ўсе жорсткія расправы з нашымі зарубежнымі братамі дружна адкажам уступленьнем у рады МОПР'у і матар'яльнай дапамогай палітзьняволеным, удовам і сіротам загінуўшых у дні 1-га мая пралетарскіх байцоў.

Няхай жыве нямецкі пралетарыят, няхай пашыраецца яго барацьба за ўсеагульнае вызваленьне.

Вечная памяць загінуўшым слаўным барацьбітом у Бэрліне!

Сьмерць катам і здраднікам рабочае клясы!

Няхай жыве III-ці Камуністычны інтэрнацыянал, які вядзе рабочых і працоўных да сваёй канчатковай перамогі!

Няхай жыве МОПР—верны дапаможнік барацьбітом рэвалюцыі!

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР.

НАМ НЕПАТРЭБНА ПАРАДНАЕ СПАБОРНІЦТВА

Шырэй уцягнуць рабочыя масы ў сацыялістычнае спаборніцтва

У ЧАДЗЕ УРАЧЫСТАСЬЦІ

Кажуць, што в прадвеку так і заведзена, што на ўрачыстых сходах дакладчыкам пытаньняў не задаюць і спрэчкі па гэтых дакладах не адкрываюць, а то «якая-ж будзе ўрачыстасьць калі спрэчкі?» Аб сацыялістычным спаборніцтве некаторыя таварышы таксама лічаць недапушчальным «адкрываць спрэчкі», бо калі адкрыеш, прападзе ўрачыстае ўражаньне ад спаборніцтва, а спаборніцтва гэта-ж урачысты кавалак сацыялізму і г. д., і г. д.

З гэтымі поглядамі трэба пакончыць як мага хутчэй, бо практыка паказвае, што ў справе арганізацыі спаборніцтва галавацяны, як і ўсюды, стараюцца прылажыць сваю руку.

На сходзе партактыву ў Барысаве, які разглядаў гэтае пытаньне—гэта яскрава высьветлілася.

Сход зьбіраўся доўга. Замест 6-ці гадзін ледзь адкрылі а 7-й, а ў палове 8-й гадзіны зьявіліся «актывістыя» в «Чырвонай Бярэзіны» і пытаюцца: «чаму так хутка пачалі?» Нехта прабаваў упесьці прапанову аб тым, каб арганізаваць спаборніцтва паміж партактывам за добрую яўку, але прапанова павісла ў паветры.

Асобныя кіраўнікі высоўваюць спаборніцтва, як парадную кампанейскую работу. Вось у будаўнічых работах Белдзяржбуду, дзе рабочы час нагружан на 50 проц., дзе значна распаўсюджана рвацтва, хуліганства на вытворчасьці і г. д., па прапанове аднаго з кіраўнічых працаўнікоў з адміністрацыі прымаецца пастанова: «уступаем у сацыялістычнае спаборніцтва». А калі сёньня запытаць любога рабочага-будаўніка, што гэта за спаборніцтва і што канкрэтна павінен рабіць рабочы, ён не адкажа. Саюз будаўнікоў таксама падтрымаў гэтую рэзалюцыю—як-жа ня ўступіць у спаборніцтва, калі ўсе ўступаюць, але калі праз тыдзень прышлося з саюзам весьці гутарку аб нормах, расцэнках і інш. празаічных прамовах, уся паэзія сацыялістычнага спаборніцтва зьнікла і саюз упёрся:

— Душа з вас вон, а даш расцэнкі і нормы мінулага году...

— Як-жа будзем узьнімаць прадукцыйнасьць працы?—запытала адміністрацыя.

— Гэта справа вашa,—адказвае саюз.

Калі завод «Камінтэрн», Бабруйскай акругі, выклікаў на спаборніцтва завод імя Домбаля, знайшліся рабочыя, якія выступілі з такімі прамовамі.

— Нам в «Камінтэрнам» няма чаго ў спаборніцтва ўступаць, яны вырабляюць бутэлькі, а мы графіны і сартовую пасуду, у нас завод дае прыбытак, а ў іх дэфіцыт—няхай яны в наліўным (ганчарным) заводам у спаборніцтва ўступаюць, а мы будзем шукаць завод сартовай пасуды...

Такія настроі, настроі чванства, высокамернасьці, не знайшлі належнага адпору з боку кіруючых працаўнікоў, і завод імя Домбаля, фармальна, прымаючы выклік заводу «Камінтэрн», пачаў падшукваць для спаборніцтва такі-ж «арыстакратычны» завод у Бранскай губэрні і выклікаў яго.

На «Домбалі», «Чырвонай Бярэзіне» і інш. прадпрыемствах арганізавалі штабы кіраўніцтва спаборніцтвам, а вытворчыя нарады і камісіі нават не абмеркавалі гэтага пытаньня. Тым часам і «штабы» таксама не сабраліся. Такое-ж становішча і ў некаторых іншых прадпрыемствах. Парад ідзе, а работа кульгае на ўсе ногі, рабочая маса ўцягнута невыстарчальна.

Культпраца на прадпрыемствах ня ўвязана з сацыялістычным спаборніцтвам. Пастарому працягваюцца спэктаклі, кіно, а аб тым, каб праз усе віды культпрацы растлумачыць рабочым значэньне спаборніцтва, не падумалі. Даходзіць да кур'ёзаў. Так, на «Чырвонай Бярэзіне» няма ніводнага лёзунгу ні ў чырвоным кутку, ні на фабрыцы, які напамінаў-бы аб сацыялістычным спаборніцтве.

Вядома, што ўсё гэтае не гаворыць аб тым, што ніякіх посьпехаў у справе спаборніцтва няма. Яны ёсьць, але ёсьць небясьпека патапіць гэтыя посьпехі ў моры красамоўства, урачыстых пасяджэньняў, рэзалюцый і т. д.

Сацыялістычнае спаборніцтва—гэта замена капіталістычных мэтадаў працы сацыялістычнымі, гэта практычнае правядзеньне ў жыцьцё пераходу да сацыялізму, але пакуль што будзе ўся гэтая справа лётаць у чадзе ўрачыстасьці, пакуль шырокія масы рабочых пад кіраўніцтвам партарганізацый ня будуць уцягнуты ў штодзенную практычную работу—сацыялістычнае спаборніцтва ня будзе мець ніякіх посьпехаў.

М. ШАПІРА.

За што распушчаны заўком „Пралетарыя"

Хвасьцізм---адзін з самых шкодных ухілаў у рабоце заўкому

Адна справа абараняць інтарэсы рабочых, а другая справа, калі гэта абарона набывае ў заўкому форму камандаваньня над адміністрацыяй у імя пратэкцыянізму і кумаўства.

Ад качагараў паступае заява аб тым, што можна абыйсьціся адным дзяжурным качагарам замест двух. Дырэктар гэта праводзіць у жыцьцё і качагар дасканала спраўляецца з работай. Другі качагар скарыстоўваецца на другой рабоце.

Заўком ня згодзен в гэтым распараджэньнем адміністрацыі, а піша дырэктару заводу грозны загад, з якога даволі працытаваць хаця-б наступнае месца:

Заўком катэгарычна забараняе вам рабіць рацыяналізацыю вытворчасьці за рахунак рабочых (?) і прапануе зараз-жа паставіць на работу ў машыннае аддзяленьне 2-х качагараў, як было раней. Адначасова забараняецца працаваць замест двух чалавек аднаму ў смальцоўцы...»

Такі-ж характар носіць і самая выпіска з пратаколу заўкому па гэтым пытаньні:

«Заўком прапануе адміністрацыі зараз-жа скасаваць уведзены парадак дзяжурства аднаму качагару і ўстанавіць пастарому 2-х качагараў...»

Ці можа ісьці гутарка аб адзіначальлі, калі цяжка вызначыць, хто зьяўляецца адміністратарам—дырэктар ці заўком.

За самавольнае кіраньне работы двух рабочых адміністрацыя абвяшчае ім па загадзе папярэджаньне. Заўком абараняе іх і прапануе рабочай частцы РККА скасаваць гэта папярэджаньне.

Вось і разьлічвайце на такі заўком, каб ён вам дапамог змагацца за працоўную дысцыпліну.

Праводзячы ўпчыльненьне рабочага дня ў цёрачным цэху адміністрацыя пераравяла адтуль некалькі рабочых на іншыя работы.

Выносіцца пастанова заўкому:

«Заўком патрабуе ад адміністрацыі ў тэрміновым парадку запоўніць штаты».

Пытаньне лепшага скарыстаньня рабочай сілы зьяўляецца для заўкому ня істотным. Ён матывае сваё патрабаваньне, побач з іншымі ніістотнымі матывамі, яшчэ і тым, што могуць быць спрэчкі аб тым, які водпуск належыць пераведзенаму—па яго старой ці новай рабоце і што гэта можа адбіцца на яго матар'яльным становішчы.

У двух другіх цэхах даўно насьпела неабходнасьць перагляду пастарэлых расцэнак, дзе рабочы дзень загружаны толькі на 50 проц.

Неабходнасьць гэта была прызнана і фракцыяй заўкому, ячэйкай і райкомам КП(б)Б. Пытаньне гэта ставілася адміністрацыяй тры разы на РККА, але вынікі тыя-ж, што і з разбраеньнем у Жэнэве.

Аказваецца, што гэта невыпадкова: у гэтых цэхах многа сваякоў старшыні заўкому.

Сакратару ячэйкі падаваліся ня раз заявы аб гэтым зацягваньні з выпаўненьнем пытаньня, але яны не далі ніякіх вынікаў, бо ён не жадае страціць свой танны хвасьцісцкі аўтарытэт сярод рабочых.

Так «працаваў» заўком. На шчасьце заўком нядаўна распушчан. Будзем спадзявацца, што новы заўком улічыць памылкі старога.

Б.

Мэтады працы добраахвотных арганізацый патрабуюць зьмен

Пазбавіцца ад „мёртвых душ"

(У парадку абгаварэньня)

Нядаўна скончыўся ў Барысаве агляд працы добраахвотных арганізацый МОПР'у, ТД Асоавіяхіму і шэфскага таварыства. У выніку агляду выявілася, што, ня гледзячы на дырэктывы партарганаў, ячэйкі добраахвотных арганізацый на сутнасьці ніяк не зьяўляюцца сапраўднымі масавымі арганізацыямі па сьмесьце працы. Праўда, на больш буйных прадпрыемствах наглядаецца ўзрост колькасьці членаў ячэек, але па сутнасьці ячэйкі ў большасьці выпадкаў зьяўляюцца толькі арганізацыямі, якія займаюцца выключна зборам членскіх узносаў і рад рабочых, якія ўступілі ў гэтыя арганізацыі фактычна зьяўляюцца «мёртвымі душамі».

Пласт актыву добраахвотных арганізацый на прадпрыемствам надта тонкі, сярод яго надта мала беспартыйных актывістых, асабліва ў шэфтаварыствах. Ёсьць рад выпадкаў, калі ўся праца на шэфстве выконваецца выключна партыцамі, а беспартыйныя толькі ўносяць членскія ўзносы.

Сходы ячэек добраахвотных арганізацый склікаюцца ў сярэднім адзін раз у год, а ёсьць выпадкі, калі яны праводзяцца яшчэ больш рэдка:

У пастанове пленуму ЦК КП(б)Б аб масавай працы (ад сакавіка 1927 году) ёсьць пункт аб тым, што на прадпрыемствах павінны існаваць толькі ячэйкі МОПР'у, Асоавіяхіму і шэфскія. Але неўзабраўшы добраахвотныя таварыствы ня кіруюцца гэтай пастановай і ўсё-ж арганізуюць свае ячэйкі на прадпрыемствах. Так, напрыклад, стаіць справа з Чырвоным крыжам, т-вам Азет, т-вам прыхільнікаў дзяцей, праф нянісьменнасьць. Іх і датычыць пастанова аб разгортваньні сваёй працы паквартальна, па вуліцах, жактах і г. д. Думаю, што ў такім напрамку і неабходна разгортваць працу ўсяго добраахвотных арганізацый.

У тых ячэйках, у якіх налічваецца больш 100 членаў, трэба перайсьці ад мэтаду скліканьня агульных сходаў ячэйкі (якія немагчыма часта склікаць з прычыны перагрузкі ўсялякімі сходамі на прадпрыемствах) да дэлегацкіх сходаў, разьбіваючы ячэйкі на групкі ад 5 да 10 ч. Усе важныя пытаньні неабходна вырашаць на дэлегацкіх сходах і потым праз дэлегатаў (да якіх павінна быць прымацавана пэўная група членаў таго ці іншага т-ва) растлумачваць пастановы дэлегацкіх сходаў сярод масы. Гэтае мерапрыемства дасьць магчымасьць уцягваць новыя колы рабочых і работніц, асабліва беспартыйных, у актыўную працу добраахвотных арганізацый і значна ажывіць усю працу.

Там, дзе ёсьць цэхпарт'ячэйкі, трэба пабудаваць ячэйкі добраахвотных арганізацый на тым-жа самым прынцыпе, перадаўшы парткіраўніцтва ячэйкамі добраахвотных т-ваў цэхпарт'ячэйкам, што значна палепшыць парткіраўніцтва наогул і адказнасьць за гэту працу цэхпарт'ячэек.

Улічваючы неабходнасьць узмацненьня антырэлігійнай і антыалькагольнай працы сярод рабочых, неабходна пашырыць колькасьць ячэек т-ва безбожнікаў і антыалькагольных ячэек ва лік іншых арганізацый. Апошнія павінны строга праводзіць у жыцьцё пастанову пленуму ЦК ад сакавіка м-ца 1927 г. аб пабудове сваіх ячэек не па прадпрыемствах, а па кварталах, вуліцах і жактах.

Ячэйкам добраахвотных т-ваў ня трэба захапляцца колькасным узростам, а ўзяцца за ўцягненьне сваіх членаў у актыўную працу, вызваляючыся ад «мёртвых душ».

І, нарэшце, трэба зьнішчыць дробную апеку парт'ячэек над працай ячэек добраахвотных арганізацый, больш шырока ўцягнуць беспартыйных рабочых у актыўную, кіраўнічую працу гэтых арганізацый.

Бяз гэтых мерапрыемстваў немагчыма на справе ажывіць працу добраахвотных арганізацый.

Ш.

Пакуль што толькі адны размовы

Гомельскі хлебазавод атрымаў некалькі выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва. Пытаньне абгаворвалася на пасяджэньні заўкому, дзе было вырашана склікаць агульны сход рабочых. Аднак, да гэтага часу нічога ня зроблена.

А работа надыходзіць вялікая. Трэба аднавіць працдысцыпліну, узьняць прадукцыйнасьць працы, паменшыць колькасьць глуму, наладзіць дастаўку хлеба ў магазыны. Заўважваецца нядбайнае абыходжаньне з машынамі. Разьмеркаваньне рабочай сілы часта бывае няправільнае. Некаторыя майстры не карыстаюцца аўтарытэтам.

Усе гэтыя ненармальнасьці неабходна ва што-б там ні стала зжыць. Парт'ячэйцы, камсамольская ячэйцы і заўкому пара схамянуцца. Трэба хутчэй склікаць агульны сход і абмеркаваць пытаньне аб сацыялістычным спаборніцтве.

Х—ч.

АБЯЦАНЬНЕ ВІЦЕБСКАГА НАСТАЎНІЦТВА

ліквідаваць няпісьменнасьць сярод насельніцтва

ВІЦЕБСК, 17/V. (Наш кар.). Сацыялістычнае спаборніцтва расьце і шырыцца, ахапляючы ўсё новыя групы працоўных. У апошнія дні ў спаборніцтва ўступілі і працаўнікі апчадных кас, якія абавязаліся выканаць поўнасьцю заданьне па ўцягненьні новых укладчыкаў, скараціць да мінімуму час, што затрачваецца на выкананьне касавых апэрацый, зьнішчыць усялякае праяўленьне бюракратызму і цяганіны ў рабоце кас.

Надзвычайна важны дагавор, заключаны канфэрэнцыяй асьветнікаў Бешанковіцкага раёну з раённым выканаўчым камітэтам. Настаўніцтва ўзяло на сябе абавязак дармова ліквідаваць няпісьменнасьць сярод насельніцтва раёну. Яно абавязалася дабіцца ня менш 90 проц. наведваньня па сельскіх школах і 98 проц. па 7-мігодках, прычым асаблівая ўвага будзе зьвернута на ўцягненьне ў школу пастухоў і батракоў. Акрамя таго настаўніцтва абяцае паставіць на належную вышыню антырэлігійнае выхаваньне сярод вучняў. Дзень адпачынку з нядзелі пераносіцца на другі дзень. Канфэрэнцыя выклікала на спаборніцтва асьветнікаў усіх іншых раёнаў акругі.

Рабочыя і служачыя фабрыкі паперы «Чырвоная Зорка» (Чашнікі) прынялі выклік Шклоўскай фабрыкі «Спартак». У сваім адказе яны даюць урачыстае абяцаньне павялічыць на 15 проц. прадукцыйнасьць працы, зьнізіць сабекошт прадукцыі на 25 проц., зьнізіць глум, зжыць прагулы. Адначасова рабочыя з «Чырвонай Зоркі» выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва рабочых фабрыкі паперы «Прафінтэрн» (Барысаў).

ВЕСНАВАЯ СЯЎБА не застала нас зьнянацку

Саўгасы, калгасы і сялянства засяваюць палі ачышчаным насеньнем

Бабруйшчына ў першых радох

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Справа калектывізацыі на Бабруйшчыне ідзе шпаркім крокам. Ня будзе памылкай, калі скажам, што ў гэтай галіне Бабруйшчына выперадзіла ўсе округі Беларусі.

Так, за час веснавой пасеўнай кампаніі арганізавалася 79 новых калектыўных гаспадарак. З арганізаваных калгасаў амаль што ўсе ўжо з пачатку вясны прыступілі да супольнай работы.

Сотні сялянскіх гаспадарак, якія аб'ядналіся ў калгасах, пачалі жыць пановаму. У шмат якіх калгасах ужо аграмаджаны сродкі вытворчасьці. Калектыўна праводзіцца сяўба, сеюць ачышчаным і гатунковым насеньнем, якое блаўмоўна павышае ўраджайнасьць. На вестках, усе калгасы поўнасьцю ачысьцілі сваё насеньне.

У акрузе праведзена вялікая работа па ўзбуйненьні калгасаў. Узбуйнена па акрузе 22 калгасы. Некаторыя гаспадаркі, як, напрыклад, «Расьсьвет» (Жлобінскі раён), зараз, пасьля ўзбуйненьня, налічвае 84 сям'і «11-я гадавіна Кастрычнікавае Рэвалюцыі»—75 сем'яў, «Прамень камуны» (Старобінскі р)—62, «Таль» (Любанскі р.)—50 і г. д.

Гэтыя буйныя калгасы зьяўляюцца першымі фабрыкамі хлеба ў акрузе. Яшчэ невыстарчальная ўвага зьвернута на стварэньне с.-г. камун. Гэта новая справа ў акрузе яшчэ не пашырана. Пакуль што стварылася толькі 5 с.-г. камун.

Толькі за апошні двухтыднёвік арганізавалася 8 новых калгасаў. Насельніцтва з вялікай ахвотай ідзе ў калгасы. Плян па калектывізацыі выкананы больш чым на 100 проц. Не адстае і работа па вытворчым каапэраваньні насельніцтва. Аб гэтым сьведчаць дзесяткі арганізаваных малочных артэляй, мэлірацыйных і тарфяных таварыстваў і дзесяткі артэляй па пераапрацоўцы іншых сельскіх прадуктаў. Гэтым Бабруйшчына можа ганарыцца.

Ч.

Масавая сяўба на Віцебшчыне

Рабочыя брыгады адрамантавалі інвэнтар 2.000 бядняцкіх гаспадарак

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Першыя весткі, што паступаюць з раёнаў, гавораць аб распачатай масавай сяўбе ва ўсёй акрузе.

Кампанія па ачыстцы насеньня прайшла ўсюды даволі пасьпяхова. Па даных акруговага зямельнага аддзелу на 1-га мая адсартавана збожжа 111 проц. намечанае колькасьці, ільнянога семя —100 проц. Збожжавым насеньнем акруга забясьпечана поўнасьцю.

Магілеў, Бабруйск і Гомель да гэтага часу ня выканалі заданьня па адгрузцы насеннай бульбы; у выніку, замест 125 вагонаў, якія чакаліся, на сёньняшні дзень атрымана ўсяго 30, рэшта яшчэ недзе «вандруе».

Стан азімых, дзякуючы добраму надвор'ю, значна лепшы, чым летась, і вызначаецца ў сярэднім па акрузе ў 3½ балы.

Заўважваецца вялікае імкненьне сялян да калектывізацыі. Да 1-га мая ўжо арганізавана 53 калгасы і 33 знаходзіліся ў стадыі афармленьня. Да гэтага-ж часу арганізавалася звыш 100 першапачатковых каапэрацыйных аб'яднаньняў.

Сёньня ў раёны выяжджае ўвесь наяўны склад спэцыялістых акруга для інструктаваньня і дакладнага абсьледваньня ходу пасеўнай кампаніі на мясцох.

* * *

Гэтымі днямі адбылася нарада рабочых брыгад, якія вярнуліся з вёскі. Каля 50 рабочых в энтузіязмам дакладвалі аб праведзенай імі рабоце на вёсцы.

У Езярышчанскім раёне адрамантаваны с.-г. інвэнтар больш 300 бядняцкіх гаспадарак. У Чашніцкім раёне замест рамонту с.-г інвэнтару 325 гаспадаркам, які раней меркаваўся, абслужана 651 гаспадарка. Наогул па акрузе абслужана каля 2.000 бядняцкіх гаспадарак. Рамантаваўся ня толькі дробны інвэнтар, але і трыеры, і ваўначоскі, і іншыя машыны. Акрамя таго, рабочымі праведзены шматлікія даклады, гутаркі, нарады. Ня гледзячы на імкненьне кулакоў падарваць работу брыгад, сялянства в захапленьнем сустракала рабочых і дзякавала за аказаную дапамогу. На імя акруговага праўленьня «Культэмычкі» паступаюць шматлікія лісты-падзякі ад сялянства.

АРГАНІЗУЕМ ДАПАМОГУ БЕДНАЦЕ Ў ЧАСЕ СЯЎБЫ

У Бабруйскай акрузе ёсьць даволі значная колькасьць бясконных сялянскіх гаспадарак.

Галоўная частка бясконных гаспадарак падае на малазямельныя бядняцкія двары.

Да веснавой пасеўнай кампаніі Акрсельбанкам разьмеркавана паміж крэдытнымі таварыствамі 25 тысяч руб. доўгатэрміновых крэдытаў на рабжывёлу. Зразумела, што гэта сума крэдытаў ян можа цалкам задаволіць патрэбу бядняцкіх гаспадарак у цягавай сіле. Акрсельбанкам даны ўказаньні ўсім крэдытным таварыствам акругі выдзеліць сродкі на крэдытаваньне бядняцкіх гаспадарак на наём цягавай сілы для засеву сваіх вучасткаў.

Вельмі важнае значэньне ў справе забясьпячэньня сельскіх гаспадарак цягавай сілай набывае арганізацыя конных калён пры селькомах. Акрсельбанкам адпушчана 1.200 руб. доўгатэрміновых крэдытаў на арганізацыю дзьвёх конных калён па 4 коняй у кожнай (пры Любаньскім і Парыцкім райКСУ). Таксама мяркуецца арганізацыя конных калён пры Асіпавіцкім і Бабруйскім райКСУ за рахунак іх уласных сродкаў.

Але ўсё-ж гэта невыстарчальна. Вакол справы забясьпячэньня бядняцкіх гаспадарак у гэтую пасеўную кампанію цягавай сілай неабходна мабілізаваць увагу ўсёй вясковай грамадзкасьці. З боку крэдытных таварыстваў, КСУ, калгасаў, саўгасаў і г. д. павінны быць прыняты ўсе захады да аказаньня практычнай дапамогі бясконным бядняцкім гаспадаркам у адносінах забясьпячэньня іх цягавай сілай. Таксама павінна быць зьвернута ўвага на большае разгортваньне работы па згуртаваньні бядняцкіх гаспадарак у таварыствы і групы па сумеснай апрацоўцы глебы.

Н.

У Росіцкім сельсавеце „зімовыя настроі"...

(ДРЫСЕНСКІ РАЁН)

Не дарма некаторыя сяляне прымежных вёсак кажуць так, што «ў нас вясна, а ў Росіцкім сельсавеце зімовыя настроі».

Як трэба было і чакаць, паважаныя таварышы з Росіцкага сельсавету склалі прыгожы, нават аршынны плян па правядзеньні веснавой пасеўкампаніі. Словам, плян быў вельмі добры, але якжа ён выконваецца?

Па пляне меркавалася арганізаваць 2 калектывы, 3 машынныя, 2 мэлірацыйныя і 1 насеннаводнае таварыстваў.

Пакуль што арганізавана толькі 1 малочная артэль з 25 гаспадарак. Да гэтага часу чамусьці не аформлены машынныя таварыствы, якім фактычна ўжо трэба было-б прыступаць да правядзеньня канкрэтнай працы. У в. Росіцах заможнікі сарвалі арганізацыю насеннаводнага таварыства. Апошняе гаворыць аб слабой працы мясцовых арганізацый.

Дрэнна стаіць справа з прасоўваньнем у шырокія сялянскія колы агранамічных ведаў. Пры мясцовай хаце-чытальні быў арганізаваны сельска-гаспадарчы гурток, які мог-бы сваёй даейнасьцю дапамагчы сялянам. Але гурток не працуе.

Пры сельсавеце па пляне было намечана правесьці сельска-гаспадарчыя курсы, прасунуць аграпрапаганду ў масы. Усім гэтым павінен кіраваць мясцовы агранам Шабасаў. Але апошні на вышэйпаказанае не зварачае належнае ўвагі. Калі хто-небудзь прыдзе, каб параіцца па пасеўных пытаньнях, або за дапамогай, дык Шабасаў кажа, што «мне зараз няма часу».

Росіцкі камітэт сялянскай узаемадапамогі, мясцовая камсамольская ячэйка маюць добрыя пляны і праекты па правядзеньні веснавой пасеўкампаніі. Але пляны застаюцца ў сваёй большасьці на паперы. Камітэт узаемадапамогі ніякай працы з беднатою не праводзіць, каапэраваньне апошняй праходзіць стыхійна, нават у некаторых мясцох самастойна без кіраўніцтва і дапамогі.

Так стаіць справа з падрыхтоўкай да сяўбы ў Росіцкім сельсавеце.

Селькор УСЬМІНСКІ.

Па Савецкай Беларусі

Будаўнічы сэзон на Асінстроі разгортваецца слаба

Асінстрой (наш кар.). Будаўнічы сэзон пачаўся ў першых числах мая месяца. Аднак, тэмп разьвіцьця будаўнічых работ ідзе вельмі марудна. Так, на пабудове галоўнага корпусу ўжо занята сто з лішнім чалавек рабочых, а працуе з трох бэтономяшалак толькі адна. Сёлета, акрамя каменнядрабілкі, бэтонамяшалак і пад'ёмнікаў для бэтону, працуе яшчэ гравамойка і лябёдкі для пад'ёму грузаў на вышыні. Матар'яламі пабудова забясьпечана амаль на 100 проц., так што ніякага затрыманьня ў рабоце быць не павінна. На пабудове пасёлку ў с. Арэхі, што праводзіцца Белдзяржстроем, таксама асабліваго ажыўленьня няма, між тым праграма работ вельмі вялікая. Паводле дагавору з Асінстроем Белдзяржстрой павінен пабудаваць 5 трохпавярховых камяніц і 4 двухпавярховыя на агульную суму мільён рублёў. Белдзяржстрой пакуль распачаў толькі земляныя работы па капаньні катлаванаў пад фундаманты толькі аднаго дому. Трэба варушыцца, бо надвор'е вельмі спрыяе будаўнічым работам, цёпла і суха.

Па пытаньні правядзеньня на пабудовах Асінстрою сацыялістычнага спаборніцтва было наладжана некалькі агульных сходаў рабочых і служачых, пастаноўлена правесьці спаборніцтвы паміж асобнымі пабудовамі, а таксама асобнымі арцелямі на лепшую будоўлю і лепшую арцель па працоўнай дысцыпліне, высокай прадукцыйнасьці працы, беражных адносінах да матар'ялу і інш. Для прэм'яваньня лепшых арцеляй будзе вылучаны асобны фонд. У зьвязку з кампаніяй за працоўную дысцыпліну заўважаецца скарачэньне прагулаў і больш сьвядомыя адносіны да справы, як рабочых, так і служачых.

Р.

Напярэдадні чысткі

БАБРУЙСК (наш кар.). Чыстка ў Бабруйшчыне пачнецца ў апошніх лічбах мая. Праводзяцца рабочыя сходы па пытаньнях чысткі і ўдзелу рабочых у яе правядзеньні. Рабочыя з свайго боку абацяюць поўную дапамогу. Для дапамогі ў правядзеньні чысткі ўтвораны 7 рабочых брыгад, у якія увайшло 104 чалавекі. Гэтыя брыгады прыступілі да працы. У якасьці практыкантаў, на зьмену вычышчаным вылучана 20 чалавек.

Ч.

Конкурс на лепшы раён у акрузе

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Гомельскі, Ўваравіцкі, Веткаўскі і Хойніцкі раёны выказалі згоду ўдзельнічаць ва ўсебеларускім конкурсе на лепшы раён. Райвыканкомы азначаных раёнаў прыступаюць да вызначэньня практычных мерапрыемстваў па паляпшэньні работы ў раёне. Лепшыя раёны будуць прэміяваны.

Справа працаўнікоў Віцебскага папраўчага дому

У свой час у нашай газэце была зьмешчана заметка аб злачынствах у Віцебскім папраўчым доме.

Зараз сьледзтва па гэтай справе ўжо скончана. Да адказнасьці прыцягваецца 10 асоб, былых служачых папраўчага дому.

Самая калёрытная фігура сярод гэтых 10 злачынцаў—загадчык жаночага аддзяленьня папраўчага дому Шантаеў Алесь. Карыстаючыся сваім службовым становішчам Шантаеў прымушаў як зьняволеных жанчын, так і наглядчыц уступаць у інтымную сувязь з ім.

Аднойчы Шантаеў даведаўся, што ў папраўчы дом паступіў зьняволены Шофман, які меў свой уласны аўтамабіль, апісаны Віцебскім акрфінаддзелам за ня выплату розных падаткаў. Шантаеў прапанаваў Шофману прывесьці аўтамабіль у папраўчы дом «схаваць», што Шофман і зрабіў. Потым Шантаеў разам з начальнікам папраўчага дому Воўкавым, его намесьнікам Брыкавым і са сваімі «дамами сердца» езьдзіў па горадзе на гэтым аўтамабілі, карыстаючыся бэнзінай папраўчага дому, пакуль аўтамабіль не сапсаваўся. За карыстаньне аўтамабілем Шофману рабіліся розныя незаконныя палёгкі.

Для вясёлага жыцьця пэнсіі не хапала і Шантаеў прысвойваў сабе грошы, што павінен быў выплачваць зьняволеным за іх работу ў майстэрнях.

Не адставаў ад Шантаева і старэйшы наглядчык жаночага аддзяленьня Каштанаў Васіль. Каштанаў пакраў розных будаўнічых матар'ялаў на 364 рублі, і, скарыстаўшы ў асабістых мэтах паслугі працаваўшага 4 дні на прымусовых работах зьняволенага, палічыў яму гэтыя 4 дні за месяцы, на які тэрмін ён быў асуджаны і вызваліў яго ад далейшай прымусовай работы.

Наглядчык Герасімоўскі Паўла таксама прысвоіў сабе 350 руб. грамадзкіх грошай.

Служачыя папраўчага дому Мароз Арцём і інструктар савецкай майстэрні Чорнамордзік Рафаіл у сваім асабістым мэтах куплялі скураныя тавары для шавецкай майстэрні ў прыватных асоб, а Чорнамордзік так добра паставіў «вучот» у сваёй майстэрні, што пры праверцы ў яго аказалася нястача абутку прыблізна на 600 руб.

Начальнік папраўчага дому Воўкаў Аляксей замест таго, каб выкрыць усе гэтыя злачынствы, дапамагаў растратчыкам.

Калі Воўкаву жанчыны скардзіліся на Шантаева, дык ён казаў:

— Вам трэба ганарыцца, што вы падабаецеся начальству, а вы яшчэ скардзіцеся!

Тых служачых, якія выкрывалі гэтыя злачынствы і даносілі аб іх у адпаведныя органы, Воўкаў звальняў са службы. Каб лепш рабіць усялякія махінацыі, Воўкаў сыстэматычна зьнімаў з работы старых служачых і на іх месца прызначаў паміма біржы працы і прафсаюзу сваіх сваякоў і добрых знаёмых.

За 2½ гады Воўкаў звольніў 192 чалавекі і прыняў на іх месца 121 чал. паміма біржы працы і мясцкому. Воўкаў гаварыў, што ў папраўчым доме не павінна быць мясцкому і яго зусім не прызнаваў.

Намесьнік загадчыка папраўчага дому Каштанаў і Брык разам з Воўкавым, загадчыкам цагельні Рысам карысталіся па сваіх кватэрах паслугамі зьняволеных. Брыкаў і Каштанаў дарэмна скарыстоўвалі працу зьняволеных нават пры пабудове сваіх дамоў.

Дзякуючы такой нездаровай атмасферы, апарат папраўчага дому пачаў разлагацца. На лаўцы падсудных апынуліся Воўкаў, Мароз, Чорнамордзік, Паджыўнас, Крогер і Рыс. Яны абвінавачваюцца па 196 артыкуле КК, Брыкаў і Каштанаў—па 196 і 205-б артыкулах КК, Герасімоўскі—204-а арт. КК і Шантаеў—па 196, 203-а і 204-а арт. арт. КК.

Справа будзе разглядацца ў Віцебскім акруговым судзе. На працэс выклікаецца 61 сьведка і 7 экспэртаў.

Б.

УЛІЧЫЦЬ МІНУЛЫЯ ПАМЫЛКІ

(Што выявілася на ўсебеларускай нарадзе адміністрацыйнатэхнічных працаўнікоў Белдзяржбуду)

Праведзеныя ўзімку тэхнічныя нагляданьні за адным з працэсаў будаўніцтва паказалі, што каля 15 проц. рабочага часу гіне дарэмна. З уцягненьнем новых кадраў рабочых гэты процант можа быць павялічан, калі ня будзе праведзена работа па ўшчыльненьні рабочага дня.

У мінулым годзе наглядаліся кепскія адносіны рабочых да матар'ялу. Адсутнічала працоўная дысцыпліна. Работа перашкаджала разгільдзяйства і нядбайнасьць. Адносіны рабочых да адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу былі недапушчальныя. Заўважвалася шмат выпадкаў пагроз. РКК аднаўляла зволеных за парушэньне працдысцыпліны. Спагнаньні на рабочых

Бруно Ясенскі

„Я жгу Париж“(*)

Жанэты ўсё яшчэ ня было. Старая вядзьмарка-маці, якая заўсёды нездаволена была сувязьзю дачкі з бедняком П'ерам, злосна зачыніла перад яго носам дзьверы і сказала, што Жанэта больш тут ня жыве.

Горад гуў, як і раней, у сваіх адвечных прылівах і адлівах. Па вуліцах праплывалі нязьлічоныя тлумы людзей, тлустых, таўстых, з адкормленымі, апаплексічнымі каркамі. Кожны з іх мог быць якраз тым, каго ён шукаў і праследаваў у вечна дарэмнай пагоні. П'ер з упартасьцю маніяка, углядаўся ў праходжых, стараючыся ўбачыць на іх тварах які-небудзь след, якую-небудзь нязначную рыску, або сударгу, пакінутую асалодай і здавальненьнем, атрыманымі з Жанэтай. Прагнымі ноздрамі ён убіраў пах убраньняў, нюхаў і стараўся ўлавіць на кім-небудзь з іх пах адкалёну Жанэты, тонкі пах яе маленькага цела.

Жанэты ня было, Жанэты ня было нідзе.

Але тымчасам яна была ўсюды. П'ер бачыў яе, пазнаваў у сілюэце кожнай дзяўчыны, якая выходзіла пад руку з каханкам з дзьвярэй кожнага атэлю, або праяжджала міма яго на таксі, або раптам зьнікала ў тунэлі першае па дарозе брамы. У тысячны раз бег ён, моцна праціскаючыся праз тлум, які разлучаў яго з Жанэтай таўстым мурам, і заўсёды прыбягаў вельмі позна.

Дні вымяняліся днямі ў аднастайнай кульні сьвятла і цемры.

Пасьля дарэмных тыдняў бадзяньня, ён кінуў ужо шукаць работы.

Шмат даён ён ужо пасіў у сабе, як маці дзіця, прагны голад, які млосна падкочваўся к горлу і разьліваўся па целе валавяным, цудовым цяжарам.

Контуры прадметаў абвастрыліся, нібы акрэсьленыя алоўкам, паветра зрабілася больш рэдкім і празрыстым пад шчыльным каўпаком паветранае помпы гарадзкога неба. Будынкі сталі расьцяжымымі і празрыстымі, то раптам усоўваліся адзін у другі, то, наадварот, расьцягваліся ў няпраўдападобнай, зьдзіўляючай пэрспэктыве. У людзей былі твары запэцканыя і нязнаныя. Некаторыя мелі па два насы, а іншыя па дзьве пары вачэй. Большасьць мела на плячах па дзьве галавы,—адна дзіўна была ўстаўлена ў другую.

Аднойчы вечарам нечаканы прыбой выкінуў П'ера з бульвараў Монмартра да шкляного пад'езду буйнога мюзік-холу. Вялізны, агністы вятрак павольна круціўся на сваёй восі, вабячы з бясконцых вуліц сьвету наіўных Дон-Кіхотаў для асалоды. Вокны акружаючых дамоў сьвяціліся яскравым, чырвоным полымем спальваючай, нясупынная ліхаманкі.

Быў час спэктаклю. Ля шкляного, сьветлага, як маяк, холу шалёна гуў чорны, ускудлачаны прыбой аўтамабіляў, каб праз хвіліну зноў адхлынуць назад, пакінуўшы на каменнай набережнай тратуару белую пену гарнастаевых палянтынаў, разьвеяных фракавых палярын, манішак і плеч.

Да бакавых дзьвярэй бурлівым патокам, піхаючыся, націскаў чорны бясконцы натоўп. П'еру здалося, што ён ужо дзесьці бачыў гэты натоўп, быў яго маленькай, згубленай часьцінкай. Успомніў такую-ж чорную, бурлівую рэчку людзей, якія душылі адзін другога ў Гале з-ва міскі супу.

Наляцеўшая хваля адкінула яго ў бок, уціснуўшы ў сьцяну, якая пры больш уважлівым агляде, была мяккім чалавечым тварам, так дзіўна знаёмым. Твар, вызваляючыся рукамі ад нечаканых абоймаў, таксама, здавалася, углядаўся ў яго пільным поглядам.

— П'ер?

П'ер напружыў памяць, стараючыся штосьці ўспомніць. Яму здалося, што ён успомніў: Эт'ен з сартовачнай.

Прабіваючы дарогу локцямі, яны выбраліся в натоўпу і накіраваліся ў завулак. Эт'ен сыпаў штосьці словамі і яго нельга было разабраць. Так, яго скарацілі таксама. Атрымаць работу нельга—крызіс. Давялося ўсякімі спосабамі здабываць сабе харч. Прадаваў марафэт (какаін). Не шанцавала, вельмі вялікая канкурэнцыя. Пусьціў у ход сваю Жэрмэну. Як-ніяк дзесятак-другі франкаў за вечар прынясе. А час настаў такі цяжкі: мала чужаземцаў і посул перавышае ўсякі попыт.

Цяпер ён—«праваднік». Работа нудная, але больш-менш карысная. Трэба ведаць некалькі адрасоў і, перш за ўсё, быць красамоўным. Гэта самае галоўнае. Трэба быць яшчэ крышку псыхолёгам, ведаць, чым каго можна ўзяць. І тут таксама канкурэнцыя, але яе ўсё-ж, будучы з добрым языком, вытрымаць можна.

Ён спэцыялізуецца па лініі пажылых паноў. Ведае некалькі дамоў, дзе трымаюць маленькіх саплячак. Гэты тавар заўсёды мае посьпех. Тут, недалёка, на вуліцы Рашэшуар—«трынаццацігодкі». Тавар пэўны. Трэба толькі ўмець падаць пад адпаведным соусам. Прадставіць: кароценькая спаднічка, хвартушок, каса з касьнічком. На гары—пакойчык-кляса. Сьвяты абразок. Ложак з сеткаю. Школьная парта, дошка. На дошцы—крэйдаю: 2×2=5. Поўная ілюзія. Ніводзін пажылы пан ня вытрымае. Ад кліента за адрас—дзесяць франкаў, ад гаспадыні—пяць.

Тут у яго свая пасада. Калі П'ер хоча, ён можа ўвесьці яго ў гэту работу. Некалькі адрасоў на вуха. Самае галоўнае—красамоўства. І ўменьне абярнуцца, ведаць, да каго падыйсьці. Лепш за ўсё чакаць перад рэстаранам. П'ер можа заняць яго ранейшае месца ля «Абэй». Вернае месца. Галоўнае—не пабытаць адрасы...

Новая хваля натоўпу раптам падхапіла П'ера і паімчала яго на плыні. Эт'ен дзесьці згубіўся. Мімаволі захоплены натоўпам, П'ер не працівіўся. Пасьля некалькіх гадзін прыліваў і адліваў, яго выкінула на пляц Пігаль.

Стракаты вадаварот рэклям. Агністыя літары слоў, напісаных у паветры нейчай нябачнай рукой. Замест: «Манэ, тэкель, фарэс»—«Пігаль», «Руаяль», «Абэй».

Пра гэта нешта казаў Эт'ен.

Ля асьветленага пад'езду стройны, расшыты галунамі, бой, мёрзьне ў сваёй кароткай жакетцы, каб адразу парабску схіліцца ў паклоне.

Два пажылыя паны. Адны. Спыняюцца на рагу. Запальваюць цыгары.

П'ер мацынальна падыходзіць бліжэй. Паны, занятыя гутаркаю, не зварачаюць на яго ніякае увагі. П'ер дакрануўся да рукава старэйшага, пузатага пана і, нахіліўшыся, мармыча яму на вуха:

— Забава... «трынаццацігодкі»... у хвартушкох... ложачак з сеткаю... дошка... 2×2=5... Поўная ілюзія...

Пажылы чалавек раптам адступіўся. Мігам абодва мэханічна хапаюцца за кішэні, дзе звычайна знаходзяцца бумажнікі. Нібы сарваўшыся з ланцугу, яны на хаду ўскочылі ў праяжджаўшае таксі, палахліва зачыніўшы дзьверцы.

П'ер застаўся на рагу адзін. Нічога не разумее. Чапляючыся за сьцены, ён пляцецца ў ноч цёмным, пустым бульварам. Вітрына. Люстра. З люстра перад ім выплывае цьмяны, зямлісты, абросшы валасамі твар з чырвонымі ліхтарамі вачэй.

П'ер спыняецца, асьветлены нечаканай здагадкай. Гэта-ж тыя двое проста спалохаліся. З такім тварам нельга шукаць заработку...

Па сярэдзіне бульвару, цалуючыся на кожным кроку, ідзе прыціснуўшыся адно да другога, пара. Маленькі капялюшык. Доўгія стройныя ногі. Жанэта! Пара ўваходзіць у гасьцініцу на рагу, не перастаючы цалавацца. Зноў таксі—праклятае таксі!—становіцца на яго дарозе.

П'ер адным скокам кідаецца на другі бок вуліцы. Дзьверы гасьцініцы сьвецяцца матавым бляскам. Шэсьць высокіх паверхаў. Дзе шукаць? У якім пакоі? Дарэмна! Лепш пачакаць тут, пакуль яны выйдуць.

П'ер стомлены, прыхіляецца да сьцяны. Праходзяць хвіліны, а можа і гадзіны. Цяпер там, напэўна, распранаюцца.

П'ер з прагнай асалодай самабічаваньня аднаўляе ў думках усе чарговыя фазы так добра захаванай у памяці пяшчоты, падстаўляючы на ўласнае месца гэтага другога, бяз твару, в пастаўленым каўняром.

Зараз, напэўна, ляжаць ужо ў ложку. Вось ён блукае рукамі па яе белым, крамяным целе. Цяпер яны сплятаюцца.

Раптам усё разьлятаецца. З гасьцініцы насупроць выходзіць пара. Тоўсты, грузны суб'ект і танклявая, стройная дзяўчына. Жанэта! Дзяўчына, становячыся на пальчыкі (як добра ён ведаў гэты рух) цалуе тлустага суб'екта ў губы. Паклікалі таксі.

П'ер гіганцкімі крокамі пераразае брук. Таксі з Жанэтай паехала. Ля дзьвярэй атэлю застаўся толькі грузны суб'ект, правяраючы пад ліхтаром свой бумажнік. На абвіслых шчоках гасьне чырвань перажытае толькі-што асалоды. На сьлюнявых вуснах вяне апошні пацалунак Жанэты. Памяты гарнітур трымае ў сабе яшчэ цяплыню яе цела, адзіны, непаўторны пах яе ўбраньняў. Нарэшце!

Адлучыўшыся ад цела, кулак сам па сабе апускаецца паміж прыпухлых павякае вачэй. Глухі шум падаючага цела. Адкормленая, як у быка шыя, пралазіць, нібы цеста, праз сьціснутыя пальцы. Зублены бумажнік бясьсільна, як падстрэленая птушка, зваліўся ў рыпшток.

На бездапаможны хрып тлусьцяка ноч адказвае працягным, прарэзьлівым сьвістам. Як на агонь сьвечкі, на ўскудлачаную грыву рыжых валасоў П'ера з усіх бакоў, з закавулкаў ночы, зьлятаюцца з трапыханьнем шарсьцяных крыльцаў, сінія кажаны.

Плаўная качка аўтамабілю, які імчыць кудысьці ў бездань прашпэкту. Мэлянхалічны пляск палярынак. І на твары халодным салдацкім саванам—амэрыканскі сьцяг з неба зоркамі зорак.

(Працяг будзе).

*) Пераклад з расійскае мовы. Выд. «Московский Рабочий».

МЕНСК

1.000 батракоў і с.-г. рабочых—у навучальныя ўстановы

У бягучым годзе ЦП саюзу сельгаслесрабочых пасылае на вучобу ў розныя навучальныя ўстановы 1.000 батракоў і с.-г. рабочых. Паводле пляну мярнуецца паслаць: у рабфакі—180 чалавек, тэхнікумы—200 чалавек, вайсковыя школы—60 чал., ВНУ—200 чал. і інш.

Выстаўка друку

У вязку з месячнікам друку, у Менску наладжваецца вялікая выстаўка друку. Для выстаўкі адведзены аўдыторыі Камвузу. У выстаўцы будуць прымаць удзел дзяржаўныя бібліатэкі, Белдзяржвыдавецтва, Выдавецтва РСФСР і інш.

Пленум рэспубліканскай доктарскай сэкцыі

Сёньня ў нутку дактароў адкрываецца чарговы пленум Рэспубліканскай доктарскай сэкцыі пры ЦП саюзу мэдсанпрацы. Пленум падводзе вынікі ўсебеларускага зьезду дактароў і абгаворыць пытаньне аб сацыялістычным спаборніцтве ў доктарскай справе. У спаборніцтве будуць уцягнуты ўсе лекавыя ўстановы Беларусі. На гэтым жа пленуме пастаўлена пытаньне аб пасылцы дактароў—стажораў і ардынатараў у вёску на работу. Пленум заслухае таксама даклад аб летняй практыцы студэнтаў-мэдыкаў.

Наркамасьветы дае справаздачу рабочым „Камунару“

Сёньня ў доме Асьветы адбудзецца першая справаздача Наркамасьветы БССР на сходзе рабочых заводу «Камунар». Побач з асноўным дакладчыкам Наркамасьветы выступаць рэктар БДУ, акадэмік Пічэта, загадчык аб'яднаньня прафтэхшколы, якая рыхтуе рабочых для заводу «Камунар», прадстаўнік ЦБ Пралетстуду і загадчык аднэй з школ Сацвыху. У канцы вечару мудэтэхнікум дасьць вялікі канцэрт.

Чыстка унівэрсытэту ад чужога элемэнту

На апошнім пасяджэньні праўленьня БДУ выключаны з складу студэнтаў па факультэце права і гаспадаркі Сакольскі Я. за антысавецкую дзейнасьць, па сацыяльна-гістарычным аддзяленьні—Гаўзе Ф., як ідэолёгічна чужы элемэнт. За захаваньне свайго сацыяльнага становішча выключаны з унівэрсытэту студэнты факультэту права і гаспадаркі Маёрава С. і Маслакоў Н. Студэнт гэтага-ж факультэту Халадноў Н. выключаны, як сын кулака. Адначасова перадана пракурору справа на асоб, выдаўшых Халаднову дакумэнты, у якіх зазначалася, што ён бядняк. Супроць Халаднова узбуджаны іск аб спагнаньні няправільна атрыманай ім ва унівэрсытэце стыпэндыі. Студэнтка Дынабург Ш. выключана як дачка гандляра, а Эмерман Ф., як чужы элемэнт.

Лягэрны збор

У пачатку чэрвеня пачнецца лягэрны збор студэнтаў. Праўленьне БДУ адпусьціла грошы для аказаньня матар'яльнай дапамогі студэнтам, якія ідуць у лягэры. Намячаюцца выезды членаў праўленьня БДУ ў лягэры для азнаямленьня з бытам і вучобай студэнтаў.

Як працуе Менскі вадаправод

(У камунальнай сэкцыі гарсавету)

16 мая адбыўся агульны сход камунальнай сэкцыі гарсавету, на якім быў заслуханы даклад тав. Добкіна аб забесьпячэньні гораду вадою.

У сучасны момант горад забясьпечваецца вадою з 5 студняў. Сёлета будзе скончана яшчэ адна студня, коштам у 70 тыс. руб. Менск выкарыстоўвае каля 20 тыс. вёдзер вады ў гадзіну.

Адна вадаправодная магістраль ляжыць ўжо ў зямлі 60 год. У зьвязку з пракладкай трамваю сёлета па Савецкай і Ленінскай вуліцах будзе зроблена перабудова магістралі. З старых труб вада будзе пераключана ў новыя. Будзе таксама перабудавана магістраль на Камароўцы з далучэньнем да яе іншых вуліц.

Праз два гады Эльвод намячае поўную перабудову ўсёй магістралі.

У сучасны момант другія і трэція паверхі дамоў днём амаль не атрымліваюць вады з-за слабай работы напорнай вежы. Узьнята пытаньне аб пабудове ў Менску новай напорнай вежы.

Рвачы з Меншвэю

(МЕНСКАЯ ПРАЦСЭСІЯ)

У канцы мінулага году ў Меншвэі пераглядаліся нормы і расцэнкі выпрацоўкі. Калектыў рабочых Меншвэю усямерна дапамагаў фабрычным арганізацыям у гэтай складанай і адказнай рабоце. Рабочыя стараліся выпрацаваць, як мага больш, каб устанавіць правільныя нормы і расцэнкі, якія адпавядалі ня толькі сваім уласным інтарэсам, але і інтарэсам прадпрыемства.

Аднак, няма сям'і бяз вырадка. І ў даным выпадку вырадкам аказалася група рабочых з 15 чалавек на чале з Ускінай, Зусінай, Гольдэргам і інш.

Гэтая група задалася мэтай ва што-б там ні стала заблытаць адміністрацыю і фабрычныя арганізацыі і дабіцца самых высокіх расцэнак і меншых норм.

Для гэтага яны ўтойвалі ад адміністрацыі прагулы, ня поўнасьцю запісвалі ў табелях усю выпрацаваную за дзень прадукцыю, касавалі запісы сваіх таварышоў і г. д.

Калі, аднак, усе гэтыя «мерапрыемствы» не дасягалі свае мэты, і расцэнкі былі ўстаноўлены правільныя, рвачы парашылі пайсьці іншым шляхам. Яны падаюць некалькі калектыўных заяў у РКК з патрабаваньнем, каб ім запляцілі за прастой, які яны нібы вярбілі на віне адміністрацыі.

Справа перайшла ў працсэсію, якая выявіла сапраўдны твар гэтых асоб і іх імкненьне чым больш грошай вырваць у дзяржавы.

Працсэсія адмовіла рвачом у іску і пастанавіла перадаць справу ў АКК-РСІ для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці за сьвядомыя прагулы і імкненьне сарваць работу па прэм'яваньні.

Працсэсія давяла да ведама РСІ аб тым, што запісы і рахункаводства ў Меншвэі вельмі заблытаны

Акрамя таго, працсэсія паказала, што адміністрацыя фабрыкі несваячасова рэагавала на ўсе махінацыі групы прагульшчыкаў і рвачоў.

С. Г.

За дзень

БЕЛ. ДЗЯРЖ. ВАНДРОЎНЫ ТЭАТР НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ. 17-га мая БДВТ выехаў на Гомельшчыну.

Тэатр прабудзе ў падарожжы 2 з пал. месяцы. Першыя астаноўкі будуць: Асіпавічы, Жлобін, Буда, Чэчэрск, Ветка.

КОННЫ МАНЕЖ У МЕНСКУ. У бліжэйшы час у Менску адкрываецца спэцыяльны конны манеж. На манежы будуць праводзіцца заняткі па навучаньні верхавой язьдзе.

— ВАРШТАТЫ ДЛЯ ВЫТВОРЧАСЬЦІ АЛОЎКАЎ. Канструктар-вынаходца А. Дамбэ закончыў работу па канструваньні варштатаў для вырабу алоўкаў. Бюро садзейнічаньня рабочаму вынаходніцтву адпусьціла дадаткова т. Дамбэ 60 р.

МЭХАНІЗАЦЫЯ БАРЫСАЎСКАЙ ЦАГЕЛЬНІ. Для мэханізацыі Барысаўскай цагельні Белдзяржстрой закупіў у Маскве 8 новых варштатаў і машын.

ПЧАЛЯРНЫЯ ПАВАЗАЛЬНЫЯ ПАСЕКІ. Сёлета Наркамзем закладвае па БССР 12 навукова-паказальных пчалярных пасек. На гэтую мэту адпушчана каля 5 тысяч рублёў.

НАВУКОВА-ХАРЧАВЫ САВЕТ. Навукова-харчавы савет Беларусі перайшоў пад загад Наркамату аховы здароўя. Старшыня савету—тав. Барсукоў. У склад савету ўваходзяць праф. Экзэмплярскі, Разанаў, дактар Хазанаў і інш.

ХЭМІЧНЫЯ КУРСЫ. Беларускае Т-ва «Чырвонага Крыжу» арганізуе ва ўсіх округах Беларусі хэмічныя курсы па перападрыхтоўцы дактароў.

ПАБУДОВА БУЛЬБАСХОВІШЧАЎ. Белсельсаюз у бліжэйшы час пачне пабудову ў Менску, Гомелі і іншых округах 7 бульбасховішчаў. Ёмкасьць кожнага сховішча разьлічана на 20 тыс. пудоў бульбы.

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД САЮЗУ ПАЛЯЎНІЧЫХ. У сучасны момант па ўсёй БССР праходзяць акруговыя і раённыя зьезды і канфэрэнцыі членаў саюзу паляўнічых. Усебеларускі зьезд паляўнічых оклікаецца ў ліпені месяцы.

АДПРАЎКА ХВОРЫХ У САНАТОРЫ «САСНОЎКА». 21 мая ў сухотны санаторы «Сасноўка» адпраўляецца чарговая партыя хворых рабочых і служачых у ліку 140 чал.

500 ЧЫРВОНЫХ ПЭДАГОГАЎ. Навучальны год у пэдтэхнікумах Беларусі скончыцца 7-га чэрвеня. Сёлета пэдтэхнікумы выпусьцяць кала 500 пэдагогаў. Пасьля 15 чэрвеня Наркамасьветы разьмяркуе іх для работы па сакоўках БССР.

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЗЬНІШЧЭНЬНЕ ДРАПЕЖНІКАЎ. Саюз паляўнічых, Наркамзем і Дзяржстрах арганізуюць з 15 чэрвеня ўсебеларускі гадавы конкурс па зьнішчэньні драпежнікаў. Утворана конкурсная камісія. На прэмяваньне адпушчана 4 тыс. руб.

ПРАЕЗД ТАВ. БРАЎКОВІЧА. Учора праехаў праз Менск у Маскву на 5 Усесаюзны зьезд саветаў дарадчык пры паўнамоцным прадстаўніцтве СССР у Польшчы тав. БРАЎКОВІЧ.

ПЭДАЛЁГА-ПЭДАГАГІЧНАЯ ЭКСПЭДЫЦЫЯ. З Менску выехала ў Койданаўскі раён пэдалёга-пэдагагічная экспэдыцыя пэдфаку БДУ і Галоўнавукі для вывучэньня дзяцей школьнага ўзросту. У экспэдыцыю ўваходзіць 13 чалавек. Сярод іх маюцца дактары дзіцячага дыспансэру. Экспэдыцыя прабудзе ў Койданаўскім раёне каля двух тыдняў.

Абарона сельскіх актывістых

За актыўную працу па выяўленьні недахопаў і злоўжываньняў у вёсцы, за рашучы адпор кулацкаму наступленьню на беднату вёскі і на мерапрыемствы па сацыялістычным будаўніцтве вёскі, сельскія актывістыя часта падпадаюць пад помсту кулакоў і іх прыхільнікаў.

Больш усяго звычайна з мэтай помсты падпальваецца маемасьць актывістага, які, будучы да гэтага бедняком, зусім застаецца бяз жыльля.

У зьвязку з агульнымі мерапрыемствамі камуністычнай партыі і савецкай улады, Дзяржстрах прыняў наступныя мерапрыемствы:

У выпадку, калі будынкі сялянскага двара, членам якога зьяўляецца грамадзкі працаўнік, будуць спалены з-за помсты на глебе службовай ці грамадзкай дзейнасьці гэтага працаўніка і калі гэта будзе ўстаноўлена, дык Дзяржстрах сплачвае за згарэўшыя будынкі поўную суму страты па страхавой ацэнцы нават без спагнаньня дадатковай прэміі.

Таксама, калі ў гэтых будынках згарыць жывёла, вастрахаваная па акладным страхаваньні, дык за яе Дзяржстрах сплачвае поўную суму яе сапраўднай цаны да пажару.

Такое мерапрыемства ўводзіцца з мэтай абароны сельскіх актывістых ад кулацкай помсты і заахвочваньня савецкай актыўнай часткі вёскі да рашучай барацьбы з кулацкім наступленьнем, да рашучай барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва вёскі, да працы сельскіх актывістых па выкрыцьці недахопаў і ўсялякіх хваравітых зьявішч у вёсцы.

ЕРМАКОЎ.

У Менск прыяжджае яўрэйскі пісьменьнік Фэфэр

Па запрашэньні праўленьня БелАПП'у ў Менск прыяжджае яўрэйскі пралетарскі пісьменьнік Украіны тав. Фэфэр для выступленьня на двух літаратурных вечарох.

Тав. Фэфэр нарадзіўся на Украіне, рабочы-друкар, былы актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны. Сваю творчую дзейнасьць тав. Фэфэр пачаў у першыя гады пасьля Кастрычніка ў рэвалюцыі. Для яго творчасьці першага перыяду характэрна адабражэньне грамадзянскай вайны і ўдзелу ў ёй яўрэйскіх рабочых мас. На гэтую тэму тав. Фэфэр даў дасканалыя ўзоры мастацкіх твораў.

Тав. Фэфэр выступіць у Менску на 2-х вечарох, якія арганізуе культадзел ЦПСБ і ЦП саюзу працасьветы.

Перасовачная школа Асоавіяхіму прыяжджае ў Менск

У Менск прыяжджае з Масквы перасовачная школа Асоавіяхіму па падрыхтоўцы інструктараў стралковага спорту. Школа будзе працаваць у Менску 1½ месяцы, пасьля чаго накіруецца на некалькі тыдняў у Гомель.

Папраўка

Ва ўчорашнім нумары газэты «Зьвязда» па тэхнічным недагледзе пад артыкулам «Дэзэртыр з партбілетам» памылкова быў зьмешчаны подпіс: М...ў «Д. К.» Гэты подпіс адносіцца да артыкулу „Аб асобных задачах і мэтадах чысткі і праверкі вясковых арганізацый“.

Паведамленьні

— БДУ. Сёньня, 18 мая, а 7-й г. увечары ў антавай залі БДУ адбудзецца сход камуністых і камсамольцаў аўдыторыі усіх факультэтаў БДУ.

Парадак дня: Чарговыя задачы партыі ў аўд. асяродзішчы. Даклад. тав. Валабрынскі.

Яўка абавязкова.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня, а 7 гадз. адчынены сход яч. ЛКСМБ Працасьветы.

Парадак дня: справаздача 7-га групкому.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня, а 8 г. ув. адчыненьне летняга саду. Заўтра, а 6 г. ув. сход зноў запісаўшыхся ў гурток фізкультуры; а 11 г. р. паояджэньне прэзыдыуму дому.

— Сёньня, 18 мая, а 5 гадз. увеч. у аўдыторыі Паталёга-анатамічнага інстытуту адбудзецца сход студэнтаў V курсу мэдфаку па пытаньні выпуску.

— У нядзелю, 19 мая у 12 г. дню ў памяшканьні клюбу «Розы Люксэмбург» склікаецца пленум цэнтральнага савету саюзу бязбожнікаў. Нарада кам. фракцыі а 10 г. раніцы.

— У панядзелак, 20 мая, а 6 гадз. ув. ў памяшканьні Фрунзаўскага РК КП(б)Б адбудзецца нарада шэфтаварыстваў Астрашыцка-Гарадзецкага раёну сумесна з прадстаўнікамі падшэфнага раёну.

Парадак дня:

1. Вынікі вясеньняй пасеўнай кампаніі
2. Аб асельнай кампаніі,
3. Арг. пытаньні.

Яўка старшынь шэфтаварыстваў, стар. шынь жэнсэкцый і членаў райшэфбюро абавязкова.

Фрунзаўскае Райшэфпраўленьне

— 20 мая, а 6 гадз. увечары ў памяшканьні Фрунзаўскага райкому КП(б)Б адбудзецца нарада па пытаньні аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва.

На нараду павінны зьявіцца санпратары вытворчых ячэек, старшыні фабзаўкомаў—партыйцы і кіраўнікі прадпрыемстваў—партыйцы Фрунзаўскага раёну.

— ПЭДГАБІНЭТ. У панядзелак, 20 мая, роўна а 7 з пал. гадзіне ўвечары сход сэкцыі па антырэлігійным выхаваньні.

Парадак дня:

1) Мэтодыка антырэлігійнае работы ў 2, 3 і 4 групах сямігодкі (дакл. т. т. з Цэнтральнай Дасьледчай школы).

2) Антырэлігійная праца ў 1-й школе (даклад т. Гальчука).

Яўка сяброў сэкцыі абавязкова.

Запрашаецца настаўніцтва.

— У нядзелю, 19 мая, а 1 гадз. дня ў памяшканьні канцэляры Жакт'у № 8 гор. Менску па Чырвонаармейскай вул. № 10 склікаецца нарада камуністых Жакт'у па пытаньні аб перавыбарах праўленьня Жакт'у.

На гэту нараду павінны зьявіцца ўсе камуністыя, што жывуць у домах Жакт'у № 8.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б

У суботу, 18-га мая ў ДОМЕ СЕЛЯНІНА адкрываецца

III-ці ПЛЕНУМ МЕН. АК

Пачатак роўна а 7-й гадз. увечары

Прысутнасьць усіх членаў і кандыдатаў АК і прэзыдыуму абавязкова.

Запрашаецца гарадзкі актыў.

Запрашальныя білеты па райкомах.

Прэзыд. Мен. АК. МОПР'у.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Субота, 18 мая,

Паказальнай школе Белпэдтэхікуму

МОСТ

Астача білетаў у касе тэатру

У нядзелю, 19 мая—апошні раз у гэтым сэзоне адкрыты спэктакль (перанесены з 12 мая) „ЗАПЯЮЦЬ ВЕРАЦЁНЫ“. Астача білетаў у касе тэатру.

КІНО-ТЭАТР „Культура“ — Ад чацьвярга, 16 мая ВЯСЁЛАЯ КАНАРКА

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Адчыненьне скора! НА ЭКРАНЕ сусьветны амэрык. фільм. Сачэце за рэклямай!!!

КІНО Інтэрнацыянал — Кіно-рэв'ю ШКЛЯНОЕ ВОКА. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.

КІНО Пралетары — Ад аўторка 14 мая ЗЬВІНІГАРА. Пачатак а 7 г. 15 м. Каса—ад 6 г.

1-шы ДЗІЦЯЧЫ кіно-тэатр Юны піянэр (будынак кіно „ПРАЛЕТАРЫ“) — АД АЎТОРКА, 14 МАЯ ТЭНЛЕЙ У ГЛЫБІ АФРЫКІ апошняя 4-я серыя ў 9 частк. Пачат. 1-га сэансу а 3 гадз. дня.

КІНО Спартак — Амэрыканскі сусьветны фільм ПАРЫЖАНКА драма ў 8 част. Пас таноўна Чарлі Чапліна. Зьвыш праграмы—выступл. Н. В. РОНСКАЙ і сатырыка В. ГУРСКАГА ў новым рэпэртуары

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА

Ленінск., побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-06

АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч.

Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутран., хірургічн., жаночыя, зубныя, хваробы вока, нэрвоў, хваробы вуха, горла і носа і хваробы скуры.

ФІЗІЯТРЫЧНЫ ГАБІНЭТ нэарц. электра і сьвета лячэньне

РЭНТГЕНАЎСКІ ГАБІНЭТ робіць здымкі, прасьвечваньне і лячэньне хворых. Прыём хімічна-бактэрыялёгічных аналізаў.

КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПРАФЭСАРОЎ

Прымаюць па папярэднім запісе

Па хвар. вуха, горла і носа—праф. Бурак па пятніцах ад 3-х гадз.
Па жаночых — —праф. Выдрын па чацьвяргох ад 6 гадз.
Па ўнутраных — —праф. Глусман па сярэдах ад 5½ пал. гадз.
Па нэрвовых — —праф. Кроль па чацьвяргох ад 6 гадз.
Па хваробах вока — —праф. Камінскі па пяніцах і чацьвяргох ад 3—4 гадз.
Па ўнутраных — —праф. Мелніх па чацьвяргох ад 5 з пал. г.
Па хірургічных — —праф. Рубашоў па пятніцах ад 4 гадз.
Па хірургічных — —праф. Сакалоўскі па аўторках ад 5—6 гадз.
Па кішэчна-страўн. — —дацэнт Менасэон па аўторках ад 8 гадз.
Па хваробах скуры — —д-р Розэнталь па суботах ад 12 да 1 з пал. гадз. і па сярэдах ад 8 г. ув.
Па дзіцячых хвар. — —др Гурэвіч па суботах ад 10 да 12 гадзе.
Па хваробах зубоў і поласьці роту—дацэнт Старобінскі па пятніцах ад 6—7 г. увеч.

Прыём хворых па лекавых кніжках таварыства.

— Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

АДКРЫТА

ЗУБА-ЛЯЧЭБНІЦА

Мен. Акр. К-ту Чырвонага Крыжу, Інтэрнацыянальная вул., д. № 6.

Лячэньне, плёмбаваньне зубоў, выдаленьне бяз болю, лячэньне хвароб поласьці роту.

УСТАЎКА ШТУЧНЫХ ЗУБОЎ на каўчуку і золаце.

Цэны агульнадаступныя. Парада дармова.

У пячэбніцы працуюць кваліфікаваныя зубныя дактары з вялікім практычным стажам.

Членам Чырвонага Крыжу—СКІДКА.

Прыём з 9 з пал. г. ран. да 8 з пал. гадз. увечары штодзённа.

19 МАЯ

УВАГА!!!

У НЯДЗЕЛЮ, 19 МАЯ А 12 ГАДЗІНЕ ДНЯ на ПЛЯЦЫ ВОЛІ

АДБУДЗЕЦЦА ВЯЛІКІ

КНІЖНЫ КАРНАВАЛ

З ПРЫЧЫНЫ АДЧЫНЕНЬНЯ

КНІЖНАГА РЫНКУ

У КАРНАВАЛЕ ПРЫМУЦЬ УДЗЕЛ: усе рэдакцыі гор. Менску, саюз друкароў, фізкультурнікі, піянэрарганізацыі, мопраўцы, саюз бязбожнікаў, Чырвоная армія, асоавіяхімаўцы і дзіцячыя сады.

СКІДКА АД 10% ДА 90%

Іграе аркестр МУЗЫКІ, цікавыя атракцыёны, ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

Кніжны рынак арганізуецца БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВАМ, ГІЗ'ам РСФСР і іншымі кнігагандлюючымі арганізацыямі ў ГАРАДЗКІМ СКВЭРЫ (каля Белдзяржтэатру)

КНІЖНЫ РЫНАК ПРАЦЯГНЕЦЦА да 5-га чэрвеня

19 МАЯ

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск

Менск Галоўлітбел № 669.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2